Спецыялісты кажуць, што грып ёсць, але ён не эпідэмічны. Смяротных выпадкаў, звязаных з захворваннем на грып, не зафіксавана. Сярод пацыентаў з грыпам амаль няма тых, хто прышчапіўся. Толькі адзінкавыя выпадкі. СТАР 2

Аляксандраўскі, Кагановіцкі, Кастрычніцкі — тры назвы, якія захоўваюць у сабе мінулае, сучаснасць і будучыню сталічнага раёна, які ў сакавіку адзначыць 75-годдзе з дня ўтварэння. СТАР 3

У беларускіх нябёсах парадку нашмат больш, чым на зямлі. Таму што сочыць за ім унікальная арганізацыя — РУП «Белаэранавігацыя» (свайго роду нябесная інспекцыя). СТАР 4

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЛЮТАГА 2013 г. ЧАЦВЕР № 29 (27394) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Дом урада

«ТЭСТ» ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ

Савет Міністраў разгледзеў вынікі года леташняга і задачы на год бягучы

Калі меркаваць па першай рэакцыі на даклад міністра эканомікі Мікалая Снапкова, пашыранае пасяджэнне Савета Міністраў па выніках года і задачах на бліжэйшае будучае было гарачым. Беларусь ужо ўступіла ў зону асаблівай адказнасці — альбо сёння, альбо будзе занадта позна. На пасяджэнні Савета Міністраў, якое адбылося ўчора, ішла ўсхваляваная размова пра заўтрашні дзень краіны, які вызначаецца зараз. Пра мадэрнізацыю, яе правільнае разуменне і адказнасць кіраўнікоў. Час на ментальную перабудову скончыўся. Час дзейнічаць. І дзейнічаць тэрмінова.

Сістэмныя задачы вырашаны

Вынікі мінулага года і першага месяца гэтага сведчаць, што многія службовыя асобы не ўлічылі недахопы леташняга года і не забяспечылі неабходную дынаміку сёлета, — так распачаў сваё ўступнае слова **Прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** Летась удалося вырашыць шэраг сістэмных азадач. Былі адноўлены і значна павялічыліся рэальныя грашовыя даходы насельніцтва. Дасягнутыя мэтавы прыбытак і рэнтабельнасць вытворчасці і сферы паслуг. Гэта значыць, што людзям былі выплачаны рэальна зароблены грошы. Забяспечаны знешняя і ўнутраная збалансаванасць эканомікі. Чысты прырост валюты ў краіну склаў $3,2 млрд. Бюджэт выкананы без дэфіцыту. Скарочаны валавы ўнутраны доўг краіны ў адносінах да валавога ўнутранага прадукту. Павялічаны міжнародныя рэзервовыя сродкі.

Сёння, калі закранаеш пытанні мадэрнізацыі, некаторыя кіраўнікі «валяюць ваньку»: «А што мадэрнізаваць? А як? А што нам за гэта дадуць?». У аснове гэтых пытанняў ляжаць выдаткі дзяржаўна-адміністрацыйнай эканомікі і безадказнасць кіраўнікоў.

Разам з тым вынікі могуць і павінны былі быць лепшымі, адзначыў кіраўнік урада. Амаль Br21 трлн дабаўленага кошту краіна недаатрымала з-за невыканання прагнозных паказчыкаў. Найбольшую страту прынеслі горад Мінск (Br 11,7 трлн) і Брэсцкая вобласць (Br2,2 трлн).

Не выканалі патрабаванні кіраўніка дзяржавы па ўзроўні заработнай платы Брэсцкая і Віцебская вобласці. Больш за палову прагнозных паказчыкаў у 2012 годзе не выканала Міністэрства прамысловасці. Прэм'ер-міністр адзначыў пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў канцэрне «Белнафтахім» і заклікаў урад на гэтым прыкладзе разабрацца, у чым сутнасць дзейнасці канцэрна як кіруючага органа.

Згадаў Старшыня Савета Міністраў і нядаўнюю крытыку кіраўніком дзяржавы работы спажывецкай кааперацыі. Галоўным падыходам у дзейнасці спажывецкай кааперацыі Міхаіл Мясніковіч назваў пераадоленне кансерватызму. «Будзе правільным, калі ў рэгіёнах работу па ўдасканаленні спажыўкааперацыі ўзначаляць губернатары», — сказаў Прэм'ер-міністр.

Прычыны недахопаў — чалавечы фактар

Недахопы мінулага года Міхаіл Мясніковіч назваў невыпадковымі і абумоўленымі суб'ектыўнымі фактарамі. Аднак і старт гэтага года аказаўся несуцяшальным: «правалены інвестыцыі» па шэрагу рэгіёнаў. «Без інвестыцый мадэрнізацыя проста немагчымая, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр. — Як і без інавацый. Кіраўнікам усіх узроўняў трэба звярнуць асаблівую ўвагу на інавацыйныя праекты, накіраваныя на новыя якасці росту, новую эканоміку. Усё гэта свайго роду тэст для міністра і кіраўнікоў канцэрнаў на прафесійную прыгоднасць: ці здольныя кіраўнікі вытворчасцяў прапанаваць і рэалізаваць інавацыйныя праекты — праекты будучыні».

«Сёння, калі закранаеш пытанні мадэрнізацыі, некаторыя кіраўнікі «валяюць ваньку»: «А што мадэрнізаваць? А як? А што нам за гэта дадуць?» — з абурэннем заўважыў Прэм'ер-міністр і прызнаў, што ў аснове гэтых пытанняў ляжаць выдаткі дзяржаўна-адміністрацыйнай эканомікі і безадказнасць кіраўнікоў.

Ёсць грошы і праекты, няма смелых

Прэм'ер-міністр назваў наступныя прыярытэты мадэрнізацыі: інтэграцыі з вядучымі сусветнымі кампаніямі, развіццё прыватнага і прыватна-дзяржаўнага сектараў, строгае патрабаванне з кіраўнікоў, дзяржаўная падтрымка і заахвочванне дырэктарскага корпусу і кіраўнікоў, якія актыўна ўдзельнічаюць у пытаннях мадэрнізацыі.

«Крайне дрэнна міністры і кіраўнікі абласцей і сталіцы працуюць па прыцягненні выгадных крэдытаў, — заўважыў Міхаіл Мясніковіч. — Сёння свабоднымі з'яўляюцца $12 млрд кітайскіх крэдытных ліній, а эфектыўных праектаў мала. Нацыянальны банк зняў усе абмежаванні па крэдытаванні юрыдычных асоб пад мадэрнізацыю. Перавышэнне валютных патрабаванняў над абавязкамі складае Br2,5 трлн. Гэта значыць, што грошы ёсць, але няма праектаў. Больш дакладна: ёсць праекты, але кіраўнікі не жадаюць у іх удзельнічаць, рызыкаваць і браць на сябе адказнасць». СТАР 2

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗЯМЛЯ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

14 лютага — дзень, якога рамантычная моладзь з нецярпеннем чакае ўвесь год. Ружовыя сэрцы, мяккія цацкі і шчырыя прызнанні — здаецца нават, гэта прыгатавана ў закаханых яшчэ загадзя. Аднак далёка не кожны ведае, кім насамрэч быў святы Валянцін і куды можна накіравацца ў нас, каб шчыра прызнацца ў пачуццях адно аднаму. Напярэдадні свята закаханых карэспандэнт «Звязды» наведаў адзіны ў Беларусі прыход святога Валянціна. Якая яна, зямля гэтага святога?

Смалявічы — невялічкі райцэнтр на Міншчыне. Вялікай славы ён не мае, але колькі гадоў таму інтэрнэт літаральна запаланіла інфармацыя, што каля тамтэйшага касцёла ўсталявалі бронзавую фігуру святога Валянціна. Пра гэта пісалі інфармацыйныя рэсурсы і ў Расіі, Украіне, а польская версія вядомай анлайнавай энцыклапедыі «Вікіпедыя» ў нататках пра Смалявічы мела толькі адну спасылку — звестку пра бронзавую выяву ўшанаванага моладдзю святога, якую ўсталявалі на ахвяраванні мясцовых вернікаў. «Я працаваў усё лета, і ў верасні скульптура была гатова, — восенню 2008 года ў тэлефоннай размове са мной прызнаўся Яраслаў Філіповіч, аўтар кампазіцыі, былы студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. — Акцэнты, безумоўна, зрабіў на твар і рукі. Галоўным было стварыць вобраз натхнёны, чысты».

Фігуру святога відаць яшчэ здалёк. Летам на гэтым пагорку над невялічкай рачулкай сапраўды прыгожа. Паабапал растуць кветкі, а недалёка ціха шэпчуць старадаўнія дубы. Зараз літаральна ўсё апранута ў снежныя шаты, але ўсё роўна да фігуры святога, які нахіліўся ў блаславенні, заўважаем пратаптаную сцежку. Кажуць, што дакрануцца да рукі святога — добрая прыкмета, якая прынясе шчасце ды каханне. СТАР 8

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім КАРМАЗІН, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:

«У краіне створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця агратурыстычнай дзейнасці. Для ўладальнікаў сельскіх сядзіб дзейнічае падатковае паслабленне, ёсць магчымасць атрымання льготнага крэдыту, прадугледжаны парадак афармлення запрашэнняў замежнікам для адкрыцця візы. Даходы ад сельскага турызму летась павялічыліся ў два разы. Уладальнікі сельскіх сядзіб атрымалі летась больш як Br44 млрд, абслужыўшы 184 тыс. турыстаў. На канец 2012 года ў Беларусі налічвалася 1775 сельскіх сядзіб».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.02.2013 г.

Долар ЗША	8650,00	■
Еўра	11630,00	▼
Рас. руб.	287,50	▲
Укр. грыўня	1067,24	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	0°
Віцебск	– 5°
Гомель	– 2°
Гродна	0°
Магілёў	– 5°
Мінск	– 3°

■ Май на ўвазе

У 2016 годзе — за электрычнасць па сабекошце

Пра гэта ўчора паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па збыце энергіі рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскэнерга» Юрый Мішук.

Зараз у нашай краіне дзейнічае сістэма перакрыжаванага субсідзіравання, калі прадпрыемствы пакрываюць затраты на электраэнергію, якія не даплачвае насельніцтва. У Мінскэнерга ўпэўнены, што падобнае субсідзіраванне адмоўна паўплывае на развіццё айчынных прадпрыемстваў, таму ад яго ў свеце масава адмаўляюцца.

Цяпер у Беларусі застаюцца самыя нізкія тарыфы для насельніцтва па аплаце за электрычнасць у параўнанні з суседнімі краінамі.

Паводле слоў Юрыя Мішука, з 1 лютага фізічныя асобы плацяць прыкладна каля 4 цэнтаў USD за кВт/гадзіну электрычнасці пры яе сабекошце амаль у 10 цэнтаў. У выніку насельніцтва кампенсуе нават менш за палову затрат энергетыкаў на вытворчасць і дастаўку электраэнергіі спажыўцам.

Сяргей КУРКАЧ.

■ «Звязда» віншуе юбіляраў

«ЗВЯЗДОВЕЦ» ПА СПАДЧЫНЕ,

ЦІ Журналісцкая кар'ера пачалася...

Днямі сын наборшчыка падпольнай «Звязды» Барыс Александровіч адзначыў 75-гадовы юбілей. Газета пісала пра лёс гэтага незвычайнага чалавека і яго знакамітага бацьку. Супрацоўнікі рэдакцыі асабіста павіншавалі «хроснага сына падпольнай «Звязды» з днём нараджэння. З гэтай нагоды шаноўнаму юбіляру было ўручана пасведчанне ганаровага карэспандэнта рэспубліканскага выдання.

Такога падарунка, як прызнаецца Барыс Хасанавіч, ён нават і не чакаў. Аб карэспандэнцкай кар'еры звяздоўца ён марыў даўно: ад бацькі ў яго засталася асаблівая любоў да газеты на роднай мове. Ды і сам ён, як той рэпарцёр, не прапусціць ні адной падзеі ў жыцці краіны. Барыс Хасанавіч — актыўны наведвальнік шматлікіх выстаў, тэатраў, спартыўных мерапрыемстваў...

— Асабліва стараюся не прапускаць хакейныя турніры і матчы, — прызнаецца **Барыс АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — Вельмі люблю гэты від спорту! Цяпер у мяне з'явілася магчымасць не толькі за ім назіраць, але і пісаць пра яго.

Гаварыць пра хакей Барыс Хасанавіч можа бясконца. Як аказалася, яго старэйшы сын працуе трэнерам па хакеі ў Канадзе. Там жа гэтым відам спорту займаецца і яго ўнук. З дзецьмі і ўнукамі часта бачыцца, на жаль, няма магчымасці (малодшы сын з сям'ёй таксама жыве ў Канадзе). Перыядычна размаўляюць па скайпе. Аднойчы любімы дзядуля іх наведваў. Тыя дні, праведзеныя за мяжой з роднымі, Барыс Хасанавіч успамінае з асаблівай цеплынёй.

У мінулым Барыс Александровіч — наборшчык. Працаваў у Акадэміі навук, пасля амаль 40 гадоў — у выдавецкім аддзеле БНТУ. Паралельна — мастацкім афарміцелем кніг у многіх выдавецтвах краіны. СТАР 2

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАКІСТАН УСЛЕД ЗА ІНДЫЯЙ МОГУЦЬ АДХІЛІЦЬ АД УДЗЕЛУ Ў АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ

Міжнародны алімпійскі камітэт (МАК) разгледзіць пытанне выключэння са сваіх шэрагаў Пакістана за ўмяшанне ўлад Ісламскай Рэспублікі ў справы Пакістанскай алімпійскай асацыяцыі (ПАА).

Прадстаўнікі ўрада Ісламскай Рэспублікі і ПАА былі запрошаны ў штаб-кватэру МАК для абмеркавання сітуацыі, якая склалася, аднак ніякага адказу ад іх атрымана не было. Раней з аналагічнай сітуацыяй сутыкнулася суседняя Індыя. У мінулым снежні МАК часова прыпыніў членства ў сваіх шэрагах Алімпійскай асацыяцыі Індыі, якая перастала атрымліваць субсідыі. Акрамя таго, індыйскія чыноўнікі зараз не змогуць наведваць па запрашэнні МАК буйныя спартыўныя спаборніцтвы, а спартсмены — прадстаўляць рэспубліку на Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульнях пад нацыянальным сцягам. Тое ж самае можа неўзабаве чакаць і Пакістан.

З РАСІЙСКАЙ ЭКАНОМІКІ ЗА 18 ГАДОЎ НЕЛЕГАЛЬНА ВЫВЕДЗЕНА 211,5 МЛРД ДОЛАРАЎ

Амерыканская міжнародная даследчая арганізацыя Global Financial Integrity, якая адсочвае перамяшчэнні па свеце нелегальных грашовых сродкаў, прадставіла даклад, прысвечаны Расіі.

Паводле яго, аб'ём ценявой эканомікі ў Расіі, якая складаецца з кантрабанды наркотыкаў, гандлю зброяй і людзьмі, склаў 46% ад ВУП за перыяд даследавання — 18 гадоў. З Расіі нелегальна вывезена як мінімум 211,5 млрд долараў у той час, калі прыток нелегальнага капіталу склаў 552,9 млрд. Агульны аб'ём нелегальных фінансавых патокаў (прыток і адток) склаў 764,3 млрд долараў. Асноўным спосабам нелегальнага вываду грошай з Расіі аўтары даклада лічаць выкарыстанне заснаваных расійскімі камерцыйнымі структурамі даччыных кампаній у Еўропе і шэрагу афшорных зон, якія выводзяць грошы з краіны пад відам экспартна-імпартных аперацый. У апошнія гады на першае месца і сярод атрымальнікаў, і сярод крыніц расійскіх прамых замежных інвестыцый выйшаў Кіпр.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ІРАН СТРАЦІЎ 3-ЗА НАФТАВАГА ЭМБАРГА 40 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ

Страты іранскай эканомікі ад нафтавага эмбарга Еўрасаюза ў 2012 годзе дасягнулі 40 мільярдаў долараў. Пра гэта заявілі ў Міжнародным энергетычным агенцтве (МЭА).

Па ацэнцы МЭА, у студзені 2013 года здабыча сыравіны ў ісламскай рэспубліцы знізілася да мінімуму за апошнія 30 гадоў — 2,65 мільёна барэляў у суткі. Да ўступлення ў сілу санкцый ЕС Іран здабываў 3,7 мільёна барэляў у суткі, а ў сярэдзіне 2000-х аб'ёмы дахадзілі да 4,2 мільёна барэляў. У канцы студзеня іранскія ўлады паведамілі пра спыненне экспарту нафты і газу ў еўрапейскія краіны ў адказ на санкцыі ЕС. У лютым мінулага года Тэгеран спыніў пастаўкі вуглевадародаў у Францыю і Вялікабрытанію. У сярэдзіне студзеня гэтага года прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад упершыню публічна прызнаў эканамічную шкоду ад санкцый заходніх краін. Выступаючы перад парламентам, кіраўнік дзяржавы заявіў, што з-за эмбарга замарудзіліся тэмпы росту эканомікі. Ахмадзінежад адзначыў, што Тэгерану неабходна пераадолець празмерную залежнасць ад нафтавых даходаў. Продаж нафты з'яўляецца галоўнай крыніцай даходу іранскага бюджэту. Пасля ўступлення ў сілу нафтавага эмбарга мясцовая нацвалюта патаннела ў тры разы. Заходнія дзяржавы ўвялі абмежавальныя меры, спрабуючы прымусіць Тэгеран адмовіцца ад ядзернай праграмы, падчас якой ісламская рэспубліка, як мяркуецца, спрабуе стварыць атамную бомбу.

КАРОТКА

Дзіцячы конкурс «Еўрабачанне-2013» пройдзе ў Кіеве 30 лістапада.

На Чарнобыльскай АЭС пад цяжарам снегу 12 студзеня адбылося частковае абрушэнне сценавых панэляў і часткі даху непрацуючай машыннай залы чацвёртага энергаблока. Пры гэтым, як сцвярджае адміністрацыя, парушэнняў умоў бяспечнай эксплуатацыі аб'екта «Укрыцце» няма.

У Беларусі пражываюць больш як 27 тыс. ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў і больш як 630 членаў сем'яў загінулых у Афганістане і іншых краінах, дзе вяліся баявыя дзеянні.

У нашай краіне з 18 лютага 2013 года пачне дзейнічаць бясплатная online-кансультацыя для людзей, якія жывуць з ВІЧ (ЛЖВ), і людзей, якія закрануты гэтым захворваннем. Усе ахвотныя змогуць задаць пытанні ў рэжыме Skype-чата кансультанту. Skype-імёны і іншыя звесткі тых, хто звернецца па кансультацыю, не будуць раскрывацца.

ЯКІ ВАШ ЛЮБІМЫ МАСТАЦКІ ТВОР ПРА САПРАЎДНАЕ КАХАННЕ?

Алег Дзьячкоў, старшыня гарадской арганізацыі ТБМ г. Магілёва:

— «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча — мой любімы мастацкі твор, дзе каханне займае адно з пачэсных месцаў. Сяброўства галоўнага героя трылогіі Алеся Загорскага з Міхалінай Раўбіч, якое перарастае ў прыгожае і ўзнёслае каханне, не можа пакінуць абыякавым нікога.

Дынамізм разгортвання падзей, захапляльнасць сюжэта, мастацкая адорванасць аўтара — усё гэта разам робіць чытача ўдзельнікам гісторыі кахання. А паколькі аповед ідзе пра мясціны на сярэднім Падняпроўі магілёўскага краю, то я, як карэнны магіляўчанін, з захапленнем сачу за лёсам цікавых і прыгожых герояў «Каласоў». Падобную гісторыю кахання я ў жыцці не сустракаў. Хаця магчыма, што менавіта сапраўднае каханне — гэта галоўнае ў чалавечым жыцці.

Алена Барысава, галоўны рэдактар тэлеканала «Магілёў-2»:

— Я цяпер у захапленні ад новай кінастужкі «Ганна Карэніна». Я з хваляваннем чакала англійскую інтэрпрэтацыю, бо з усяго Талстога аддаю перавагу менавіта гэтаму твору, і не расчаравалася. Мне спадабалася, таму што атрымалася гісторыя пра сапраўднае каханне. Там зусім няма звыклай павучальнасці. Там ёсць думка, што каханне ўсё выкупіць і ўсё даруе.

У кожнага — свая гісторыя кахання. Мы заўсёды цытуем з гэтай кнігі, што ўсе сем'і аднолькава шчаслівыя і па-рознаму няшчасныя. У гэтым кінафільме паказана праўда: у кожнага чалавека — сваё каханне і сваё шчасце. І каханне сапраўды ўсё загладзіць. І няхай гэта трагедыя, але кахала Карэніна да глыбіні душы — а гэта, напэўна, галоўнае.

Андрэй Скорабагатаў, галоўны рэдактар дырэкцыі тэлебачання тэлерадыёкампаніі «Магілёў»:

— Для мяне вобраз сапраўднага кахання — гэта жанчына і мужчына, якія ляцяць разам над дамамі і садамі маленькага горада. Гэта вядомая карціна Марка Шагала «Над горадам».

У ёй ёсць сапраўдная магія. Тым больш, калі ведаеш, што жанчына, чый вобраз Шагал увасабляў практычна ва ўсіх сваіх творах, — яго адзіная сапраўдная каханая і муза Бэла. Калі мастак убачыў яе ўпершыню, яму падалося, што яны знаёмыя ўсё жыццё. Ім нават не спатрэбілася гутарка, каб зразумець узаемныя пачуцці. Каханне — гэта палёт. Напэўна, так і адчуваў Шагал, калі ствараў самую рамантычную карціну ўсіх часоў і народаў.

Запісала Ілона ІВАНОВА.

«ТЭСТ» ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

За сем папярэдніх гадоў краіна дастаткова ўклала сродкаў у абнаўленне зношаных асноўных фондаў. Сёння задача стаіць трохі іншая: укладаць грошы так, каб мець больш адчувальную аддачу.

«Не проста мадэрнізацыя дзеля мадэрнізацыі, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр. — Кожны рубель інвестыцый павінен аддаваць 2-3 рублі дадатковага кошту. Акупнасць асноўных праектаў павінна быць 3, максімум — 5 гадоў».

Бізнэс, жыллё, лагістыка

Сярод бліжэйшых задач урад вызначыў у першым паўгоддзі стварыць умовы для ўваходжання Беларусі ў першую трыццатку краін па зручнасці вядзення бізнэсу. Ужо з першага квартала ўсе жылыя дамы неабходна праектаваць як энергаэфектыўныя. Да 2015 года 100% новага жылля ў нашай краіне павінна адпавядаць еўрапейскім экалагічным стандартам па захаванні цяпла і эканоміі электрычнасці.

Для будаўніцтва жылля лічу мэтазгодным дазволіць крэдытаванне фізічных асоб у валюце. Прашу Нацыянальны банк і камерцыйныя банкі падтрымаць.

«Для будаўніцтва жылля лічу мэтазгодным дазволіць крэдытаванне фізічных асоб у валюце, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Прашу Нацыянальны банк і камерцыйныя банкі гэта падтрымаць».

Сёлета аб'ём сродкаў насельніцтва, які накіроўваецца на будаўніцтва жылля, павінен вырасці больш як на Br15 трлн, паведаміў Прэм'ер-міністр. «І без належнай крэдытнай падтрымкі па даступных працэнтных стаўках рэалізаваць гэта будзе проста немагчыма», — падкрэсліў ён. Ураду варта тэрмінова распрацаваць і зацвердзіць прыярытэты транспартна-лагістычнай палітыкі. Гэта вялікая сістэмная задача, з-за невырашэння якой краіна ўжо зараз нясе страты, якія ў будучыні вырастуць шматкроць. З 1 студзеня 2013 года Беларусь працуе ва ўмовах уніфікаванага чыгуначнага тарыфу, што выклікае вялікую колькасць скаргаў. У сувязі з гэтым кіраўнік урада даручыў Мінэканомікі распрацаваць парадак прадстаўлення выключных тарыфаў. «Мера вымушаная, але вытворцаў трэба падтрымаць. Пры гэтым будуць прад'яўляцца адпаведныя патрабаванні і да грузаадпраўкі», — сказаў ён.

Тэхналагічныя паркі і малыя прадпрыемствы

Урад павінен надаць больш увагі развіццю буйных кластараў, якія па сваёй значнасці з'яўляюцца нацыянальнымі праектамі. Сёлета трэба будзе забяспечыць знешнімі інжынернымі сеткамі Беларуска-кітайскі індустрыяльны парк і правесці неабходную падрыхтоўчую работу па рэалізацыі першых беларуска-кітайскіх праектаў. «Я вельмі разлічваю на актыўную работу Мінскага аблвыканкама ў гэтым кірунку», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

«У бліжэйшыя шэсць месяцаў мы павінны прыняць неабходныя рашэнні па Лельчыцкім прамысловым парку. Размова ідзе аб здабычы бурага вугалю для энергетычных мэт, распрацоўцы гранітных кар'ераў, будаўніцтве чыгункі, а таксама праектах лесаперапрацоўкі», — дадаў Прэм'ер-міністр.

Адначасова з развіццём магутных сістэмаўтваральных кластараў вельмі важна і стварэнне дадатковых працоўных месцаў у малых населеных пунктах па ўсёй краіне. Аднак даручэнне ўрада стварыць у кожным раёне як мінімум 10 арганізацый з колькасцю не больш за 50 чалавек не было выканана. Ёсць раёны, дзе не створана ніводнай новай арганізацыі вытворчага характару — ні вялікай, ні маленькай. Гэтая задача, між тым, заклікана прадухіліць дэмаграфічны калапс у не такой ужо і далёкай будучыні, на што звярнуў увагу ў сваім дакладзе міністр эканомікі.

Кіраўнік урада падкрэсліў, што выканаўчая ўлада не вырашае палітычныя пытанні, яе сфера дзейнасці — эканоміка. Ён папрасіў кіраўнікоў усіх узроўняў не тапіць справу ў паперах і паставіцца да вызначаных задач з усёй адказнасцю.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«ЗВЯЗДОВЕЦ» ПА СПАДЧЫНЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння былы наборшчык вельмі сумуе без працы. Толькі вось душой ён яшчэ не на пенсіі. У вольны час катаецца на каньках, ходзіць на лыжах у Сілічах. Барыс Хасанавіч прызнаўся, што не адчувае свае гады.

І сапраўды, гэты чалавек ніяк не выглядае на свой узрост. Заўсёды ў добрай форме, з выдатным настроем, ён шпацыруе на чарговы спектакль ці спаборніцтва. Яго і сёння перапаўняюць новыя творчыя ідэі. З тымі, якія датычацца «Звязды», ён падзяліўся і з намі.

— Паколькі зараз адбываецца будаўніцтва новага Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, ёсць добрая нагода расшырыць экспазіцыю, якая датычыцца гісторыі выдання, — перакананы Барыс Александровіч. — Тым больш, я магу дапамагчы супрацоўнікам музея ўзнавіць тыя падзеі, якія звязаны з гісторыяй падпольнай «Звязды». Пакуль яшчэ жывыя сведкі тых трагічных падзей, трэба як мага больш пакінуць пасля сябе будучым пакаленням.

Ёсць у Барыса Хасанавіча і яшчэ адна прапанова. Частку вуліцы Кульман (усяго на некалькі дамоў), дзе раней у доме Таццяны Якавенкі размяшчалася падпольная друкарня газеты і дзе зараз знаходзіцца помнік газеце «Звязда», вярнуць яе былую назву — Выдавецкая. Гэтая назва найбольш адпавядае гістарычнай праўдзе: менавіта тут у гады вайны кіпела сапраўдная выдавецкая справа. Да слова, да прыходу немцаў у доме на гэтай вуліцы жыў з жонкай і малымі дзецьмі сам легендарны наборшчык Хасан Мустафавіч Александровіч.

Зрабіць усё магчымае дзеля ўшанавання памяці «Звязды» — доўг сына чалавека, які некалі рызыкаваў сваім жыццём, каб чытач меў магчымасць атрымаць газету.

Вераніка КАНЮТА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Тры імгненні захаваў фотааб'ектыў на памяць пра сустрэчу Барыса Александровіча з супрацоўнікамі газеты «Звязда». Наш госць выступіў перад журналістамі, познаёміўся з летапісам газеты, дзе сабраны партрэты звяздоўцаў сярэдзіны мінулага стагоддзя (некаторых з іх Барыс Александровіч ведаў асабіста), атрымаў пасведчанне ганаровага супрацоўніка «Звязды».

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З Капыльскага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты звярнулася бабуля ўнукаў, якія на момант званка жанчыны ў рэдакцыю былі вымушаны прапусціць заняткі ў школе, паколькі іх не забраў аўтобус.

— Ужо пайшоў трэці новы навучальны год, як у нас закрылі сярэднюю школу. Сказалі, што будуць возіць дзетак у суседнюю Семежаўскую: выдзелілі транспарт, зацвердзілі графік руху школьнага аўтобуса. Але па ім транспарт праехаў дакладна ці не першы і адзіны дзень, — некалькі эмацыянальна і здалёк распачала заяўніца. — Вось сёння кіроўца не заехаў, каб забраць маіх унука і ўнучку. І раней такое здаралася: каб патрапіць на школьны аўтобус, дзецям даводзілася ісці больш за кіламетр да месца, дзе ён спыняўся.

РАСЧЫСЦЯЦЬ ДАРОГІ — ПАДВОЗ ВУЧНЯЎ АДНОВЯЦЬ

Паводле слоў жанчыны, у такую сітуацыю трапляюць — з-за месца жыхарства — толькі яе ўнукі. Усе астатнія дзеці жывуць нашмат бліжэй да месца спынення аўтобуса, які падвозіць да школы вучняў.

Мы аператыўна звязаліся з аддзелам адукацыі Капыльскага райвыканкама, каб высветліць прычыну: чаму школьны аўтобус не заехаў, каб забраць дзяцей? Напрошвалася версія, што прычына магла быць у нядаўнім снегападзе...

— Падвоз навучэнцаў з вёскі Чырвоная Дубрава ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Семежаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа» вядзецца транспартам аддзела адукацыі: да месца навучання і назад.

Пасадка дзяцей у вёсцы Чырвоная Дубрава адбываецца з прыпыначнага пункта, які знаходзіцца каля будынка колішняй школы. Унукі вашай заяўніцы — вучні 7 і 8 класаў — пражываюць у вёсцы на вуліцы Макраны, якая знаходзіцца за 1,3 кіламетра ад прыпыначнага пункта, — распавяла намеснік начальніка аддзела Алена Міхайлоўская. — Зараз у сувязі з несвоечасовай расчысткай (на момант звароту — **С.Р.**) дарожнага пакрыцця філіялам камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінаблдарбуд» — ДРБУ-124 — арганізаваць рух аўтобуса да вуліцы Макраны не ўяўляецца магчымым. Кіраўніцтвам установы адукацыі «Семежаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа» накіравана пісьмо дырэктару філіяла КУП «Мінаблдарбуд» — ДРБУ-124 аб арганізацыі работ па расчыстцы дарог у вышэйназваным населеным пункце. Пры ўмове расчысткі дарог ад снегу падвоз навучэнцаў з вёскі Чырвоная Дубрава з вуліцы Макраны будзе адноўлены.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Сезонная захваральнасць

ГРЫП ЁСЦЬ, ЭПІДЭМІІ НЯМА

На каранцін па грыпе ў краіне закрыта цяпер усяго 7 школ. Спецыялісты кажуць, што грып ёсць, але ён не эпідэмічны. У цэлым назіраецца стабільная сітуацыя сезоннага ўздыму захваральнасці. Смяротных выпадкаў, звязаных з захворваннем на грып, не зафіксавана.

Намеснік міністра — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Ігар ГАЕЎСКІ:

— Нельга недаацэньваць сітуацыю з грыпам, аднак не варта і пераацэньваць. Як правіла, большая частка людзей хварэе літаральна 2-4 дні ў лёгкай форме, і толькі невялікая колькасць людзей са спадарожнымі хранічнымі захворваннямі трапляе ў зону рызыкі, паколькі грып можа працякаць у такім выпадку больш цяжка. Чамусьці калі мы кажам пра злоўжыванне алкаголем ці тытунёвую залежнасць з пункту гледжання шкоды для здароўя, гэта ўспрымаецца досыць спакойна, а вось само слова «грып» выклікае непадробную цікавасць. Але ж рызыка для здароўя ад злоўжывання тым жа тытунём значна большая!

Пачынаючы з чацвёртага каляндарнага тыдня гэтага года, у нас адзначаецца некаторы пад'ём захваральнасці на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі. Зараз сітуацыя стабілізуецца, у некаторых рэгіёнах Гродзенскай і Брэсцкай абласцей захваральнасць зніжаецца. Верагодна, з наступнага тыдня колькасць падобных выпадкаў будзе набліжацца да нормы. Нейкіх асаблівасцяў у працяканні сезоннай захваральнасці на ВРВІ і грып не адзначаецца. Дзякуючы ў тым ліку і правільна арганізаванай рабоце медустаноў. Быў падоўжаны рэжым работы паліклінік, субота аб'яўлена рабочым днём, а ў нядзелю арганізавана дзяжурства ўрачоў. Для разгрузкі ўчастковых тэрапеўтаў мы накіравалі ўрачоў-інтэрнаў. Словам, даступнасць паліклінічнай дапамогі была забяспечана ў поўным аб'ёме.

Я, мае калегі рэгулярна наведвалі і наведваем паліклінічныя арганізацыі, сетку аптэчных установ, стацыянары. Не паўсюль усё адназначна, аднак нічога нестандартнага, што можа выклікаць нейкую дэстабілізацыю ў краіне, няма. Гэта пацвярджаецца статыстыкай, інфармацыяй з месцаў. Сваю ролю адыграла і тое, што ў апошнія гады мы правялі дастойную работу па вакцынацыі насельніцтва. Сярод пацыентаў з грыпам амаль няма тых, хто прышчапіўся. Толькі адзінкавыя выпадкі. Апошнія гады пераконваюць у тым, што і надалей яшчэ больш шырокія слаі трэба ахопліваць імунізацыяй.

В.а. намесніка дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Аляксандр ПЯТКЕВІЧ:

— Барацьба, кантроль у гэтай галіне будуецца на трох асноўных прынцыпах. Гэта разуменне прыярытэтнасці праблемы на дзяржаўным узроўні, праца спецыялістаў і работа з насельніцтвам. Першае — гэта вакцынацыя, на якую дзяржава выдаткоўвае сродкі. Бо альтэрнатывы для абароны насельніцтва ў цэлым проста няма. Што да работы спецыялістаў, то на ўсім зямным шары пастаянна ажыццяўляецца маніторынг сітуацыі ўздыму захваральнасці. Уся інфармацыя аналізуецца, даюцца прагнозы, выпускаюцца вакцыны. Насельніцтва ж павінна мець на ўвазе, што ў нас наогул назіраецца некалькі пад'ёмаў захваральнасці на ВРВІ і грып — у верасні-кастрычніку, студзені-лютым, сакавіку. Сёлетнія выпадкі грыпу пачалі выяўляцца недзе ў снежні. Цяпер колькасць гэтых выпадкаў крыху большая. Дамінуюць сёння вірусы грыпу H1N1, H3N2 і вірус групы В. Недзе да 7% прышчэпленых людзей могуць усё роўна захварэць на грып. Падчас падобных сезонных уздымаў захваральнасці на ВРВІ і грып варта, па магчымасці, пазбягаць людных месцаў і не забывацца на гігіену рук. На працягу дня мы да 300 разоў дакранаемся да твару, і ўзбуджальнікі інфекцыйных захворванняў «перасяляюцца» такім чынам з нашых рук на слізістыя.

Галоўны тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Вадзім СУШЫНСКІ:

— Лепш за ўсё пры першых прыкметах вострага рэспіраторнага віруснага захворвання адразу ж паказацца ўрачу, можа быць, выклікаць медработніка на дом. Найперш для таго, каб паменшыць шанцы перадачы віруса іншым людзям. А таксама для таго, каб атрымаць адпаведную, у некаторых выпадках актыўную меддапамогу. З мэтай жа прафілактыкі нельга забывацца ў гэты час года на вітамінізацыю, якая зараз забяспечвае эфект, супастаўляльны з імунізацыяй.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Меркаванне

УТРЫМАНСТВА АБО САЦЫЯЛЬНЫ КРЫЗІС?

Глабальны крызіс, які прымусіў усіх еўрапейцаў развітацца з дзяржавай усеагульнага дабрабыту, вядома, не мог не закрануць і Беларусь

І вось на мінулым тыдні ў Беларусі, бадай, упершыню афіцыйна было пастаўлена складанае і нязручнае пытанне аб утрыманстве. На пасяджэнні калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік заявіў, што праблема ўтрыманства пачынае ўяўляць рэальную небяспеку для дзяржавы.

Заява, скажам прама, вельмі супярэчлівая ў Беларусі, якая традыцыйна разглядаецца як сацыяльная дзяржава і з'яўляецца такой па Канстытуцыі. Але Анатоль Апанасавіч растлумачыў, што менавіта ён мае на ўвазе: «чалавек сам павінен клапаціцца пра сваё здароўе, пра дабрабыт сваёй сям'і. А мы павінны дапамагаць тым, хто ў гэтым сапраўды мае патрэбу — і не па паперах, а рэальна». Таксама віцэ-прэм'ер прызнаў, што ўтрыманства шмат у чым з'яўляецца наступствам дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, якая праводзіцца ў Беларусі: «сацыяльнае ўтрыманства — гэта зваротны бок дзяржаўнай дабрыні».

Як бы ў працяг гэтай заявы ў байнэце сталі гучаць даволі радыкальныя выказванні і прапановы па барацьбе з гэтым самым утрыманствам. Сутнасць іх у тым, што пара канчаць з «саўком», пара вызваліць эканоміку ад дармаедаў, якія цягнуць яе ўніз, і ў цэлым пазбавіцца ад усяго неэфектыўнага.

Праблема з падобнымі заявамі ў інтэрнэце не толькі палітычная (хоць і гэта важна, бо яны папросту падштурхоўваюць краіну да поўнага разрыву з тымі прынцыпамі, якія ляжалі ў аснове беларускай дзяржаўнасці як мінімум з сярэдзіны 1990-х гадоў, а рэальна — 1919 года).

Ёсць пытанне яшчэ важнейшае: яно звязана з тым, што спрошчаная пастаноўка праблемы ўтрыманства вядзе краіну да сацыяльнай і эканамічнай катастрофы.

Як асоба, якая нясе ўсю паўнату адказнасці за кожнае публічна сказанае слова, Анатоль Тозік даволі дакладна растлумачыў, што ён разумее пад сацыяльным утрыманствам. Гэта, перш за ўсё, адмова чалавека самастойна клапаціцца пра сваё здароўе, пра дабрабыт сваёй сям'і. Гэта свядомая адмова ад працаўладкавання на карысць гультайства і атрымання дзяржаўнай дапамогі. Гэта, нарэшце, свядомае знішчэнне сябе, свайго здароўя, а іншы раз — і здароўя сваіх блізкіх праз алкагалізм, наркаманію, асацыяльны лад жыцця.

«Утрыманства» такога тыпу — гэта, перш за ўсё, крызіс грамадства, прыкмета яго дэзынтэграцыі, прыкмета немагчымасці ўзнавіць сваю культуру.

Характэрна, што названыя з'явы практычна ніяк не звязаны з узроўнем даходаў насельніцтва. Напрыклад, вельмі распаўсюджаны алкагалізм сярод рабочых заводаў, якія атрымліваюць немалую заработную плату. Больш за тое, сацыяльная падтрымка традыцыйнага («патэрналісцкага») тыпу, па сутнасці, толькі сілкуе падобныя дэвіяцыі.

Чаму так адбываецца?

Перш за ўсё таму, што людзі аказваюцца адарванымі ад фактараў, якія задаюць надындывідуальныя характарыстыкі іх уласнага жыцця, найперш ад жыцця ў грамадстве і пазітыўных супольнасцяў. Сацыяльнае жыццё як бы адбываецца «дзесьці там», а сам чалавек застаецца па-за ім. Як змяніць нешта ў сваім жыцці, для яго незразумела. У выніку, замест таго, каб мяняць нешта ў рэальным жыцці, чалавек пачынае маніпуляваць уласнай свядомасцю, ужываючы для гэтага алкаголь, наркотыкі, камп'ютарныя гульні і г.д.

Іншымі словамі, «утрыманства» такога тыпу — гэта, перш за ўсё, крызіс грамадства, прыкмета яго дэзінтэграцыі, прыкмета немагчымасці ўзнавіць сваю культуру.

Што адбудзецца, калі людзей, якія былі ў такім стане, перастаць падтрымліваць хоць бы на мінімальным узроўні сацыялізацыі і выкінуць у дзікі рынак?

Адбудзецца тое, што ўжо шмат разоў адбывалася ў іншых краінах (Расіі, Украіне, Эстоніі, Літве, Латвіі і іншых): паскоранае выміранне насельніцтва, паскораная далейшая сацыяльная дэзынтэграцыя і замяшчэнне карэннага насельніцтва мігрантамі. Гэта менавіта тое, да чаго прывядуць «простыя рашэнні» накшталт адмены пенсій, увядзення 100-працэнтна платнай аховы здароўя, поўнай адмовы ад дзяржаўнай падтрымкі беспрацоўных, прыватызацыі і ўтылізацыі неэфектыўных актываў і гэтак далей.

Як толькі падобны падыход становіцца пануючым, адразу аказваецца, што ў нас катастрафічна шмат чаго з'яўляецца «неэфектыўным». І чым больш мы пазбаўляемся ад «неэфектыўнага», тым менш эфектыўным становіцца тое, што мы раней такім лічылі. Таму што збавенне ад «неэфектыўнага» — гэта свядомая адмова ад пашыранага ўзнаўлення (перш за ўсё, узнаўлення рабочай сілы) і шлях у нікуды.

Сацыяльны крызіс, які робіць існуючую сістэму сацыяльнай абароны насельніцтва неэфектыўнай, патрабуе рашэнняў, адэкватных складанасці самога гэтага крызісу. І галоўны ключ да такіх рашэнняў — гэта, безумоўна, арыентаванасць на максімальнае ўцягванне самых грамадзян у паляпшэнне ўмоў уласнага жыцця і павышэнне якасці свайго жыцця.

Аднак эфектыўным сродкам такога ўключэння не можа быць толькі фінансава-эканамічная пуга. Неабходна вялікая работа, накіраваная на фарміраванне пазітыўнай суб'ектнасці грамадзян і развіццё іх самаарганізацыі ў інтарэсах павышэння якасці іх уласнага жыцця. Неабходна палітыка, накіраваная на вырошчванне супольнасцяў, аснашчэнне іх ведамі, інструментарыем дзейнасці, накіраванай на павышэнне якасці жыцця. І гэта, безумоўна, патрабуе зусім новага ўзроўню сацыяльна-інжынерных тэхналогій і інфраструктуры падтрымкі.

Такім чынам, з'явы, якія віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік у сукупнасці пазначыў як сацыяльнае ўтрыманства, уяўляюць сабой праявы крызісу беларускага грамадства і адначасовага крызісу той мадэлі сацыяльнай абароны насельніцтва, якая рэалізуецца ў краіне. Абодва гэтыя крызісы пачаліся не ўчора. У Савецкім Саюзе адпаведныя негатыўныя тэндэнцыі назіраліся з другой паловы 1960-х гадоў. Ды і ў Беларусі, нягледзячы на вывераны дзяржаўны курс другой паловы 1990-х і пачатку 2000-х гадоў, працэсы сацыяльна-дэмаграфічнай дэградацыі так і не былі спынены.

Збавенне ад «неэфектыўнага» — гэта свядомая адмова ад пашыранага ўзнаўлення (перш за ўсё, узнаўлення рабочай сілы) і шлях у нікуды.

Ключ да пераадолення гэтага крызісу ляжыць у свядомым уцягванні грамадзян краіны ў работу па павышэнні якасці свайго жыцця праз іх самаарганізацыю і падтрымку іх суб'ектнасці. Аднак захады эканамічнага прымусу ў гэтым працэсе могуць мець толькі вельмі абмежаванае ўжыванне і вельмі абмежаваны пазітыўны эфект.

Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык, кіраўнік Беларускай групы развіцця

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ЗА ШТО ДАВЯДЗЕЦЦА ПЛАЦІЦЬ: ЗА ГУРТКІ АБО ЗА ФАКУЛЬТАТЫВЫ?

Днямі ў інтэрнэце з'явілася паведамленне пра намер Міністэрства адукацыі перавесці факультатыўныя заняткі ў школах на «платныя рэйкі»: быццам бы ў галоўным адукацыйным ведамстве рыхтуецца прыкладны пералік сацыяльна значных факультатываў, якія па-ранейшаму будуць бясплатнымі для школьнікаў, а за ўсе астатнія бацькам давядзецца плаціць.

Пракаментаваць гэтую навіну мы папрасілі прэс-сакратара Міністэрства адукацыі Юлію Ваніну:

— Размова ідзе пра пералік аб'яднанняў па інтарэсах, а не пра факультатывы ў навучальных установах. Зараз і сапраўды фарміруецца пералік сацыяльна значных аб'яднанняў па інтарэсах для ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Некаторыя з аб'яднанняў па інтарэсах, уключаныя ў пералік, будуць мець бюджэтнае фінансаванне, а астатнія стануць платнымі.

Факультатыўныя заняткі ў школах уваходзяць у асобны спіс. Многія з іх выкарыстоўваюцца вучнямі і настаўнікамі ў якасці дадатковых заняткаў па прадметах. На некаторых факультатывах вядзецца падрыхтоўка школьнікаў да алімпіяд або да цэнтралізаванага тэсціравання.

Пералік сацыяльна значных аб'яднанняў па інтарэсах для ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі будзе прадстаўлены на сайце Міністэрства адукацыі напярэдадні наступнага навучальнага года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЭВАЛЮЦЫЯ БЫХАВА

Людзі бяруць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Быхава да Дня беларускага пісьменства, які адбудзецца тут 1 верасня.

За адзін месяц жыхары Беларусі ахвяравалі на аднаўленне Быхаўскага замка больш за 45 мільёнаў рублёў. Калі грошы будуць і далей так актыўна паступаць на дабрачынны рахунак, то гэта можа паскорыць працэс рэстаўрацыі помніка архітэктуры XVII стагоддзя. Цяпер стан замка абследуюць, выдаткаваныя сёлета дзяржавай 1,5 мільярда рублёў будуць у асноўным скарыстаны на праектна-каштарысную дакументацыю. Увесну пачнуцца археалагічныя раскопкі на тэрыторыі. Тут таксама плануюцца суботнікі для агульнага навядзення парадку.

Між тым Быхаў ужо адкрыў сезон суботнікаў. На першым з іх, які прайшоў 25 студзеня, на сваіх працоўных месцах быхаўчане зарабілі каля 400 мільёнаў рублёў. Усе грошы будуць выдаткаваны на стварэнне добрага дзіцячага парку ў цэнтры горада. Паводле апытання ў Быхаве, яго жыхарам найбольш не хапае месца для адпачынку з дзецьмі і пешых прагулак. Работы пачнуцца, як толькі сыдзе снег: новы аб'ект, паводле планаў, павінен быць гатовы ў сёлетнім жніўні, да пачатку рэспубліканскага свята.

Ілона ІВАНОВА.

ФЕРМЕРАЎ І ПАДАТКАЎ УСЁ БОЛЬШ

На Віцебшчыне летась фермерскія гаспадаркі пералічылі ў бюджэт каля 5,6 мільярда рублёў, што ў 2,1 раза больш, чым у пазалетась.

У падатковым ведамстве канстатуюць, што колькасць фермераў у паўночнай вобласці краіны павялічваецца. Зараз у Прыдзвінскім краі больш як 400 прыватных сельскіх гаспадарак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЯШЧЭ НЕ СТУДЭНТ, АЛЕ ЎЖО ГЕРОЙ РЭКЛАМНАГА РОЛІКА

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі арганізуе інтэрнэт-конкурс эсэ «Мая мара — БДУІР». Яго пераможца возьме ўдзел у здымках рэкламнага ролика пра ВНУ і атрымае ў падарунак электронную кнігу.

Узяць удзел у праекце могуць навучэнцы агульнаадукацыйных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Галоўная мэта конкурсу — познаёміцца бліжэй з маладымі людзьмі, якія плануюць паступаць у БДУІР, і адначасова даць магчымасць маладым людзям, якія яшчэ не сталі студэнтамі, далучыцца да жыцця ўніверсітэта.

Творчыя работы разам з інфармацыяй пра аўтара неабходна адправіць да 15 сакавіка на адрас электроннай пошты abiturient@bsuir.by з пазнакай «Інтэрнэт-конкурс эсэ». Вынікі праекта будуць падведзены 26 сакавіка, калі ў БДУІР пройдзе Дзень адкрытых дзвярэй.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БОЛЬШ ЖЫВЁЛЫ — ВЫШЭЙ ДАХОДЫ

У выніку выканання біятэхнічных мерапрыемстваў цягам мінулага года ў паляўнічых угоддзях Мінлясгаса павялічылася колькасць асноўных відаў паляўнічых жывёл.

Так, паводле інфармацыі прэс-службы міністэрства, колькасць ласёў склала 7 070 асобін (108% да ўзроўню 2011 года), аленяў — 3 500 асобін (115%), казуль — 20 910 асобін (105%), дзікоў — 20 180 асобін (103%).

Ад паляўнічагаспадарчай дзейнасці арганізацыі Мінлясгаса атрымалі амаль 24 млрд рублёў даходу, што склала 173% да ўзроўню 2011 года. Больш за іншых на паляванні зарабілі лясгасы Мінскага (каля 5,7 млрд рублёў) і Віцебскага (4,9 млрд рублёў) лесагаспадарчых аб'яднанняў.

На 82% павялічыліся даходы ад замежнага паляўнічага турызму — заробленa амаль 9,3 млрд рублёў. Тут на першым месцы Віцебскае (каля 2,5 млрд рублёў) і Брэсцкае (амаль 1,9 млрд рублёў) лесагаспадарчыя аб'яднанні. Менш за ўсіх зарабілі на замежніках у Гомельскім аб'яднанні — 790 млн рублёў. Зрэшты, гэта ўсё роўна больш запланаваных 400 млн рублёў.

Найбольшыя даходы ад эксплуатацыі паляўнічых комплексаў атрыманы ў Мінскім (1,6 млрд рублёў) і Віцебскім (амаль 1,2 млрд рублёў) лесагаспадарчых аб'яднаннях. Усяго па галіне зароблена па гэтым артыкуле даходаў больш за 5,6 млрд рублёў, што складае 199% да ўзроўню 2011 года. Дарэчы, за мінулы год было ўведзена шэсць новых і два рэканструяваныя паляўнічыя комплексы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЛЯВАННЕ НА ВАЎКОЎ

Напрыканцы мінулага тыдня ў філіяле «Выганашчанскае» дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Белавежская пушча» пачалося паляванне на ваўкоў.

Папуляцыя шэрых драпежнікаў тут даўно перавысіла нормы, а ў апошнія месяцы з'явілася яшчэ і «залётная» зграя. Яе складаюць 12 ваўкоў, яны перамяшчаюцца на вялікія адлегласці па тэрыторыі Пінскага і Івацэвіцкага раёнаў. Менавіта з гэтай зграі паляўнічыя знішчылі ў першыя дні сем звяроў. Як лічаць егеры, ліквідацыя прышлых драпежнікаў паспрыяе захаванню іншых лясных насельнікаў, якія пайшлі б на корм ваўкам.

Яна СВЕТАВА.

КАЧАК ЗАКАРМІЛІ ДА СМЕРЦІ?

Незвычайнае здарэнне было зафіксавана ў Віцебску ў вусці ракі Віцьба: тут загінулі качкі.

— Па прыбыцці на месца выкліку нашы работнікі ўстанавілі, што на лёдзе і на адкрытай вадзе знаходзіцца каля 10 мёртвых качак. Загінулых птушак дасталі на бераг і перадалі на экспертызу ў гарадскую ветэрынарную станцыю, — паведамілі «Звяздзе» ў цэнтры прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Паводле слоў **начальніка Віцебскай гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валерыя ФАНДО,** прычынай гібелі вадаплаўных мог стаць хлебны мякіш, якім гараджане падкормлівалі качак. Мяркуючы па першых выніках экспертызы, птушкі не былі пашкоджаныя якімі-небудзь інфекцыямі.

ВЫХАПІЎ ГРОШЫ... З КАСЫ

Па падазрэнні ў крадзяжы грашовай выручкі з крамы затрыманы раней судзімы 22-гадовы мінчанін.

Паводле інфармацыі з Кастрычніцкага РУУС сталіцы, малады чалавек зайшоў у гандлёвы аб'ект па вуліцы Чкалава, дзе пад выглядам пакупніка «зарыентаваўся на мясцовасці»: прыгледзеўся да адной з кас. Дачакаўшыся моманту, калі ў прадаўца была адцягнута ўвага, хлопец ухітрыўся выхапіць з прыадкрытага касавага апарата стос купюр. Пасля чаго кінуўся з крамы наўцёкі. Сума скрадзенага склала больш за два мільёны рублёў. Падазроны быў затрыманы супрацоўнікамі аператыўна-пошукавага атрада УУС Мінаблвыканкама. Зараз матэрыялы праверкі перададзены ў Следчы камітэт, дзе ім дадуць прававую ацэнку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВОСЬ ДЫК АПРАНУЛАСЯ...

118 адзінак адзення апранула на сябе 35-гадовая жыхарка Гродна, на якую звярнулі ўвагу пагранічнікі і мытнікі ў пункце пропуску «Брузгі».

Вяртаючыся дадому з Польшчы, жанчына схавала пад верхняй вопраткай «шырокі асартымент» трыкатажу — мужчынскія футболкі, кашулі, курткі. Прычым гэта была толькі частка кантрабандных рэчаў — а астатняе аказалася ў пакетах для прадуктаў харчавання. Але «нумар» не прайшоў: тавар, папярэдне ацэнены ў 23,5 мільёна рублёў, перададзены супрацоўнікам мытні.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Краіна моцная рэгіёнамі: КАСТРЫЧНІЦКІ раён Мінска

Кіраўнік адміністрацыі Анатоль ЖУКОЎСКІ:

«САПРАЎДНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ РАЁНА — ЛЮДЗІ, ЧЫІМІ РУКАМІ ЁН СТВОРАНЫ»

У сакавіку Кастрычніцкі раён сталіцы адзначыць 75-годдзе з дня ўтварэння. І гэтая знамянальная дата — добрая нагода не толькі ўзгадаць слаўную гісторыю нашага горада, але і аддаць даніну павагі тым, хто ўклаў у яго стаўленне працу і талент, хто адраджаў Мінск пасля вайны, хто забяспечвае яго паспяховае, дынамічнае развіццё.

Пра гэта наша гутарка з кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Анатолем Пятровічам Жукоўскім.

— Кастрычніцкі раён сталіцы — адзін з найстарэйшых у Мінску. Яго багатая гісторыя, напэўна, багатая на цікавыя факты, яркія падзеі і здзяйсненні?

— Аляксандраўскі, Кагановіцкі, Кастрычніцкі — тры назвы, якія захоўваюць у сабе мінулае, сучаснасць і будучыню нашага раёна. За 75 гадоў мяняліся яго межы, воблік і значэнне. Ён ператварыўся ў буйны прамысловы, транспартны, навуковы і культурны цэнтр сталіцы. І толькі адна сапраўдная каштоўнасць нашага раёна застаецца нязменнай — гэта людзі, якія жывуць і працуюць на карысць нашага дома. Людзі, чыімі рукамі ён створаны.

У Кастрычніцкага раёна багатая гісторыя. У жніўні 1921 года ў газеце «Звязда» было апублікавана паведамленне аб тым, што Цэнтральнае бюро КП(б)Б пастанавіла падзяліць горад Мінск на тры раёны па партыйнай рабоце: Аляксандраўскі, Ляхаўскі і Цэнтральны. Адзін з гэтых раёнаў, Аляксандраўскі, і стаў асновай для цяперашняга Кастрычніцкага раёна. Міналі гады, горад рос.

У 1938 годзе насельніцтва горада складала 218 тысяч чалавек. Пастановай ЦВК БССР ад 17 сакавіка 1938 года раёны былі перайменаваны ў Сталінскі, Варашылаўскі і Кагановіцкі. Замест Аляксандраўскага на карце Мінска з'явіўся Кагановіцкі раён.

У перадваенныя гады на тэрыторыі раёна знаходзіліся гарбарна-галантарэйная фабрыка імя Куйбышава, швейная фабрыка імя Крупскай, швейная фабрыка «Кастрычнік», шчаціння-шчотачная фабрыка, абутковая фабрыка (пасля ВА «Прамень»). Найбуйнейшая ВНУ рэспублікі — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — таксама размяшчалася тут.

У раёне дзейнічалі педагагічны і медыцынскі інстытуты, радыётэхнікум, 11 сярэдніх, тры сямігадовых і адна пачатковая школы.

Вялікая Айчынная вайна нанесла каласальны ўрон гораду і, у прыватнасці, раёну.

Планам аднаўлення Мінска прадугледжваліся не толькі рэстаўрацыя, але і адраджэнне сталіцы: з ярка адлюстраваным грамадска-палітычным цэнтрам, з правільным размяшчэннем у горадзе прамысловых прадпрыемстваў, жылых кварталаў, садоў і паркаў.

Самаадданая праца жыхароў хутка мяняла твар горада. Аднаўляўся і рэканструяваўся Мінскі чыгуначны вузел. Перабудоўваліся вакзал, дэпо, складскія памяшканні, іншыя станцыйныя будынкі.

Указам Вярхоўнага Савета БССР ад 17 красавіка 1951 года ў горадзе Мінску былі арганізаваны два новыя раёны — Фрунзенскі і Ленінскі. Тэрыторыя Кагановіцкага раёна была зацверджана ў наступных межах: «на ўсходзе рака Свіслач, з усходу на захад мяжа праходзіць па лініі чыгункі на Вільню і далей па вул. Р. Люксембург».

У сувязі з пераменамі, якія адбыліся ў краіне, асуджэннем культу асобы Сталіна ў ліпені 1957 года была зменена назва Кагановіцкага раёна на Кастрычніцкі.

Наступныя змяненні ў адміністрацыйным дзяленні горада Мінска адбыліся ў 1964, 1969, 1977 гадах, але не адбіліся на назве нашага раёна.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Узвядзенне буйных жылых масіваў, пераважна на свабодных тэрыторыях, дазволіла ў шырокіх маштабах ажыццяўляць комплексную забудову, укараняць паточны метад будаўніцтва, рацыянальна спланаваць новабудоўлі.

З 1948 па 1956 год, у надзвычай сціслыя тэрміны будаваўся велічны комплекс будынкаў ля паўночнага боку Прывакзальнай плошчы — два адзінаццаціпавярховыя трох'ярусныя дамы-вежы (славутыя «вароты» нашага горада). Праект быў распрацаваны творчым калектывам на чале з ленінградцам Барысам Рубаненкам. Дарэчы, у той час шматпавярховыя жылыя дамы ў Мінску будаваліся толькі на Ленінскім праспекце. Прывакзальная плошча стала выключэннем з правілаў. Тутэйшыя жылыя кварталы ўяўлялі сабой першы мікрараён сталіцы, бо тут быў у наяўнасці ўвесь сацыяльна-бытавы комплекс: школы і дзіцячыя садкі, крамы, кавярні, рэстаран, аптэка, паліклініка... Своеасаблівы мінігарад. Хрушчоўскія мікрараёны будуць стварацца значна пазней.

— Слаўнае мінулае Кастрычніцкага раёна ўражвае сваёй унікальнасцю. Аднак што ж у нашы дні з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай вашага раёна?

— Наша «візітная картка» складаецца з некалькіх параметраў. Гэта найпрыгажэйшы і найбуйнейшы ў рэспубліцы чыгуначны вакзал, які абслугоўвае жыхароў і гасцей сталіцы. Вялізную ролю ў жыцці горада адыгрываюць прадпрыемствы Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, якія перавозяць дзясяткі тысяч тон народнагаспадарчых грузаў, тысячы пасажыраў. Нацыянальны аэрапорт «Мінск» па тэхнічных характарыстыках і вытворчых магутнасцях займае адно з вядучых месцаў ва Усходнееўрапейскім рэгіёне. Геаграфія палётаў, якія выконваюцца з Мінска, ахоплівае ўсе буйныя еўрапейскія гарады, а таксама частку гарадоў краін СНД і Азіі. У аэрапорце рэгулярныя пасажырскія рэйсы выконваюць 15 авіяперавозчыкаў. На долю айчыннай «Белавіі» прыпадае каля 70 працэнтаў усіх самалётавылетаў.

Калі ж казаць пра нашы гаспадарчыя флагманы — прамысловыя прадпрыемствы — гэта, зразумела ж, тыя, якія складаюць асноўны прамысловы патэнцыял раёна: ААТ «Керамін» і ААТ «Інтэграл», а таксама прадпрыемствы прыватнага бізнэсу — ТАА «Фармтэхналогія» і ЗАТ «Мінскі завод вінаградных він». З года ў год яны дэманструюць добрую дынаміку росту, не спыняючыся ў сваім развіцці, пастаянна мадэрнізуючы вытворчасць.

ААТ «Керамін» сёння — адзін з найбуйнейшых у Еўропе вытворцаў керамічнай пліткі і санітарнай керамікі. «Керамін» — гэта высокатэхналагічнае прадпрыемства, якое дынамічна развіваецца, атрымала прызнанне на ўнутраным і знешнім рынках як вытворца сучаснай і прэстыжнай прадукцыі вышэйшай якасці.

Дзякуючы якасным сыравінным матэрыялам, бездакорнай арганізацыі вытворчасці, інавацыйным распрацоўкам і ўнікальным тэхналогіям на ААТ «Керамін» стала магчымым вырабляць рэвалюцыйную па ўласцівасцях і элегантную па дызайне керамічную плітку.

Прадукцыя прадпрыемства адзначана прэстыжнымі міжнароднымі ўзнагародамі: «Залаты глобус» (Данія), «Залатая зорка» (Іспанія), Гран-пры (Францыя), «Залаты Арол» (Германія), а таксама дыпломамі найбуйнейшых міжнародных выстаў.

У 2012—2015 гадах, згодна з распрацаванай праграмай, праводзіцца мадэрнізацыя і тэхнічнае абнаўленне вытворчасці з заменай тэхналагічных ліній. Гэта дазволіць павялічыць аб'ёмы выпуску керамічнай плітак да 2015 года да 20 мільёнаў квадратных метраў за год.

НВА «Інтэграл» з'яўляецца вядучым распрацоўшчыкам і вытворцам мікраэлектронных кампанентаў як для айчынных вытворцаў прамысловай і бытавой тэхнікі, так і для вытворцаў у краінах СНД, Еўропы і Паўднёва-Усходняй Азіі. Аб'яднанне дынамічна развіваецца, асвойваючы перадавыя тэхналогіі і рэалізуючы іх ва ўсіх напрамках сваёй дзейнасці. Узровень якасці пацверджаны нацыянальнымі і міжнароднымі сертыфікатамі ISO серыі 9000:2000.

Фармацэўтычнае вытворчае прадпрыемства ТАА «Фармтэхналогія», заснаванае ў 1991 годзе, зарэгістравала на тэрыторыі Беларусі больш за 150 лекавых прэпаратаў розных фармакатэрапеўтычных груп. Тут створана эфектыўная сістэма забеспячэння якасці гатовай прадукцыі. У інтарэсах урачоў і іх пацыентаў вырабляюцца высакаякасныя лекавыя сродкі, эфектыўнасць і бяспека якіх была шматразова пацверджана клінічнымі даследаваннямі ва ўсім свеце.

На тэрыторыі Кастрычніцкага раёна знаходзіцца ЗАТ «Мінскі завод вінаградных вінаў», утворанае ў 2000 годзе. Асноўны накірунак прадпрыемства гэта вытворчасць вінаградных він і лікёра-гарэлачных вырабаў.

Цяпер завод асвоіў выпуск больш за 200 найменняў вінаў і напіткаў.

У 2012 годзе прадпрыемствам атрымана ліцэнзія на вытворчасць віскі, па якой разліваюцца высакаякасныя алкагольныя напіткі французскага і шатландскага паходжання. Летась завод значна павялічыў аб'ёмы экспарту сваёй прадукцыі, якая пастаўлялася ў такія краіны, як Расійская Федэрацыя, Казахстан, Літва, Латвія, Германія, Малдавія.

Дзяржаўнае ўнітарнае прадпрыемства «Мінскі мясакамбінат» — адно з лепшых прадпрыемстваў мясной галіны Рэспублікі Беларусь.

Гісторыя прадпрыемства пачынаецца з 1922 года. Праектная магутнасць разлічана на перапрацоўку 100 тон мяса за змену, выпуск 90 тон каўбасных вырабаў і 80 тон мясных паўфабрыкатаў за змену. Тут вырабляюцца ўсе віды мясной прадукцыі.

У апошнія гады распрацаваны і ўкаранёны ў вытворчасць сотні новых відаў каўбасных вырабаў і паўфабрыкатаў, з іх большасць найменняў распрацавана спецыялістамі мясакамбіната па перадавой тэхналогіі, што дазваляе задаволіць попыт пакупнікоў на любы густ.

Прамысловы вузел «Калядзічы» ўвайшоў у склад Кастрычніцкага раёна горада Мінска ў 1985 годзе. Ён займае плошчу каля 200 га.

На яго тэрыторыі размешчана 14 аўтатранспартных, 10 будаўнічых і 18 прамысловых прадпрыемстваў, на працягу двух гадоў пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю 3 прыватныя суб'екты гаспадарання.

Сярод буйных прадпрыемстваў «Калядзіч» можна выдзеліць ААТ «Белмагістральаўтатранс» — шматпрофільную кампанію на рынку транспартна-лагістычных паслуг, якая забяспечвае поўны пакет транспартнага і тэрмінальнага сэрвісу ў галіне экспартна-імпартных аперацый, а таксама комплекс тэхнічнага і арганізацыйнага сэрвісу для аўтаперавозчыкаў.

Раён па праве можна назваць транспартнымі варотамі сталіцы (чыгуначнымі і паветранымі). Тут сканцэнтраваны прадпрыемствы Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі. Дэпартамент па авіяцыі і яго структурныя падраздзяленні і прадпрыемствы. Абслугоўваюць жыхароў і гасцей сталіцы найбуйнейшыя ў рэспубліцы чыгуначны вакзал, аэрапорт «Мінск-1» і Нацыянальны аэрапорт «Мінск», які знаходзіцца за 35 км ад горада і звязвае сталіцу Беларусі з многімі краінамі свету.

— У паўднёвай частцы Мінска рэалізуецца цэлая серыя маштабных інвест-праектаў, раскажыце пра іх падрабязней.

— Прыцягненне інвестараў у тэрытарыяльнае і эканамічнае развіццё раёна і горада ў цэлым з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў. Цяпер ажыццяўляецца рэалізацыя сямі інвестыцыйных праектаў з прыцягненнем як уласных сродкаў інвестараў, так і замежных крыніц фінансавання. Агульная сума па заключаных інвестыцыйных дагаворах складае больш за 700 млрд руб.

Як прыклад добрага пачатку на гэтым полі дзейнасці можна прывесці наступны факт: у снежні 2012 года ўведзены ў эксплуатацыю аб'ект «Ангар-сховішча для паветраных суднаў» у Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Праект быў рэалізаваны ў адпаведнасці з заключаным інвестыцыйным дагаворам, сума інвестыцый склала 303 млрд руб.

Зямельны ўчастак па вуліцы Каржанеўскага — Кіжаватава, які працяглы час пуставаў, плануецца да добраўпарадкавання ў другой палове гэтага года. Раёнам ужо заключаны інвестыцыйны дагавор з ТАА «Тытунь-Інвест», згодна з якім у 2014 годзе плануецца пабудаваць гандлёвы цэнтр плошчай больш за 10 тыс. кв. м. Побач будзе ўзведзены выставачны цэнтр НВЦ «БелЭкспа».

Ужо сёння вядзецца будаўніцтва СТА з шырокім спектрам паслуг, крамай па продажы аўтазапчастак, аўтамыйкі, адміністрацыйнымі памяшканнямі, пунктам грамадскага харчавання і аўтасалонам па вуліцы Магілёўскай (інвестар ТАА «Аўтаспейс»).

З прыцягненнем інвестыцый праектуюцца перспектыўныя аб'екты: гасцінічна-дзелавы комплекс па вуліцы Талстога, побач плануецца пабудаваць гандлёва-забаўляльны комплекс у раёне вуліц Талстога — Рабкораўская — Дружная. Запланавана будаўніцтва лагістычнага склада з памяшканнямі вытворчага прызначэння, падземным паркінгам і крамай па продажы аўтазапчастак па вуліцы Бабушкіна, будаўніцтва вытворчай базы ў межах прамысловага вузла Калядзічы (інвестар — ТАА «Белбуд») і іншыя.

Сярод навучальных устаноў, размешчаных на тэрыторыі раёна, — Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.

Рэалізацыя гэтых аб'ектаў дазволіць забяспечыць стварэнне новых працоўных месцаў, паляпшэнне якасці абслугоўвання насельніцтва.

— Характэрнай рысай Кастрычніцкага раёна, у параўнанні з сталічнымі «спальнымі» новабудоўлямі з іх гіпермаркетамі і дыскаўнтарамі, з'яўляецца развіццё сеткі невялікіх гандлёвых пунктаў так званай «крокавай» даступнасці. А існуе думка, што менавіта буйныя гандлёвыя сеткі хутка цалкам завалодаюць спажывецкі рынак. Звычайныя грамадзяне ад падобнага перадзелу сфер уплыву не пацерпяць?

— Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, за апошнія 10 гадоў колькасць аб'ектаў рознічнага гандлю ў горадзе Мінску павялічылася з 3,3 да 4,9 тыс. адзінак. Назіраецца тэндэнцыя далейшага значнага росту гандлёвых плошчаў.



Кастрычніцкі раён мае тэрытарыяльна-планіровачную структуру, якая даўно склалася, і шчыльна забудаваныя жылыя кварталы, як у цэнтральнай частцы (раён вуліцы Бабруйскай), так і бліжэй да ускраіны горада (вуліца Каржанеўскага, вуліца Асаналіева).

Тым не менш, нягледзячы на адсутнасць свабодных, так званых «рэзервовых» тэрыторый раён будзе працягваць развівацца, у тым ліку на землях, абцяжараных цяпер малакаштоўнай нізкапавярховай забудовай, з будаўніцтвам новага камфортнага жылля. З гэтай мэтай распрацаваны план жыллёвага будаўніцтва да 2015 года, дзе за перыяд 2013—2015 гг. УКБ Кастрычніцкага раёна і прыватнымі забудоўшчыкамі прадугледжана будаўніцтва 170 тысяч квадратных метраў жылля. Мікрараёны плануюць забудоўваць комплексна: жыллё павінна адразу ж суседнічаць з дзіцячымі садкамі і школамі, крамамі і паліклінікамі (амбулаторыямі).

які жыве ў жылым квартале або мікрараёне, выбірае зручныя невялікія гандлёвыя аб'екты, таму што там ёсць усе неабходныя прадукты. Вось чаму, на наш погляд, разам з буйнымі гандлёвымі сеткамі патрэбны і міні-крамы. Хоць з кожным годам апошнім усё цяжэй канкурыраваць з буйнымі аб'ектамі гандлю. Таму падтрымка дробных крам «крокавай» даступнасці там, дзе яны вельмі патрэбны, будзе важным этапам на шляху далейшага развіцця сферы гандлю ў нашым раёне.

— У любой бочцы мёду, як вядома, прысутнічае ложка дзёгцю. З якімі праблемамі даводзіцца сутыкацца раённаму кіраўніцтву ў нашы дні?

— Жыллёвая праблема — самая актуальная на сённяшні дзень. Няма, мабыць, такой сям'і ў Мінску, якая не была б закранута славутым кватэрным пытаннем. Камусьці кватэра неабходная як паветра зараз, хтосьці думае пра перспектыву адсялення сям'і, якая разрастаецца.

— І на заканчэнне нашай гутаркі, што вы пажадаеце жыхарам Кастрычніцкага раёна напярэдадні яго 75-годдзя?

— Напярэдадні нашага агульнага свята хачу адзначыць, што галоўнай задачай раённай адміністрацыі па-ранейшаму застаецца клопат аб паляпшэнні жыцця людзей: каб у кожнай сям'і быў дастатак, светлае і ўтульнае жыллё, усе былі здаровыя, мелі магчымасць атрымліваць добрую адукацыю і цікавую працу, хапала часу для актыўнага адпачынку. Фінансавага і сямейнага дабрабыту ўсім жыхарам Кастрычніцкага раёна. Моцнага здароўя і мірнага неба!..

Жыхары Кастрычніцкага раёна маюць магчымасць круглы год весці здаровы лад жыцця — для гэтага маюцца стадыёны, спартзалы, сучасныя закрытыя плавальныя басейны, спартыўна-гульнявыя пляцоўкі, тэніснyя корты, залы для гульні ў настольны тэніс, більярд. У зімовы перыяд функцыянуюць лядовыя каткі, лыжныя трасы, пункты пракату зімовага інвентару, гарналыжны цэнтр «Альпійскі снег» і лыжароллерная траса.

Добрую спартыўную базу маюць многія прадпрыемствы раёна. Сотні дзяцей займаюцца ў спартыўных секцыях. Сярод іх былых выхаванцаў ёсць нямала тых, хто дасягнуў высокіх вынікаў на рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах.

У 2010 годзе адкрыўся Цэнтр гарналыжнай падрыхтоўкі, які курыруецца Беларускай федэрацыяй гарналыжнага спорту і сноўборда.

На тэрыторыі цэнтра маюцца тры вучэбна-спартыўныя схілы, пункты пракату горных лыжаў, сноўбордаў і цюбінгаў. Тут праводзяцца спаборніцтвы па горных лыжах і сноўбордзе, адкрытыя рэспубліканскія першынствы сярод юніёраў, а таксама мастацка-спартыўныя святы.

Па стане на 1 студзеня 2013 года раённая рознічная гандлёвая сетка прадстаўлена 430 крамамі гандлёвай плошчай амаль 64 тысячы квадратных метраў, з іх: 130 харчовых, 300 нехарчовых, два рынкі, а таксама 25 аб'ектаў грамадскага харчавання.

Сапраўды, найбольш распаўсюджанай формай гандлю на тэрыторыі раёна з'яўляюцца крамы «крокавай» даступнасці, так званыя крамы «ля дома». У нас камфортна ўжываюцца універсальныя крамы, закліканыя фарміраваць спажывецкае асяроддзе, а таксама «суседскія» гандлёвыя пункты — невялікія крамы, якія абслугоўваюць людзей, што жывуць у непасрэднай блізкасці ад іх.

Зразумела ж, буйныя дыскаўнтары і гіпермаркеты павінны быць, але ў асноўным чалавек,

Матэрыялы старонкі падрыхтаваў Валерый ЮР'ЕЎ. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прыгожа аздобіць можна нават спальны мікрараён.

БУДНІ НЯБЕСНАЙ ІНСПЕКЦЫІ

Сёлетняй снежнай зімой як ніколі можна было пачуць ад сталічных аўтамабілістаў: вось, маўляў, заторы надакучылі, не праехаць спакойна цяпер па Мінску, з-за перападу тэмператур аварыйнасць узрасла... «Дурдом на дарогах дзеецца», — пішуць у сацсетках незадаволеныя грамадзяне.

А ці ведаюць абураныя, што робіцца прама ў іх над галовамі? Там, за аблокамі, таксама ж трасы пракладзены — толькі паветраныя, па якіх штосутачна ў розных кірунках перамяшчаюцца сотні авіялайнераў. Зірнуўшы на манітор радара, які сканує паветраную прастору, непадрыхтаваны чалавек можа быць шакіраваны мноствам мудрагелістых светлавых перапляценняў, паўсюдным мігаценнем яркіх кропак. Электроннае табло нібыта канстатуе: наша неба ў любы час сутак падобна на разварушаны мурашнік.

Але гэта толькі на першы, непадрыхтаваны, дылетанцкі погляд. Насамрэч у беларускіх нябёсах парадку нашмат больш, чым на зямлі. Таму што сочыць за ім унікальная арганізацыя — РУП «Белаэранавігацыя» (свайго роду нябесная інспекцыя). Генеральны дырэктар прадпрыемства Леанід Мікалаевіч ЧУРО ветліва пагадзіўся адказаць на пытанні карэспандэнта «Звязды».

— Леанід Мікалаевіч, што сабой уяўляе «Белаэранавігацыя» ў цэлым, абмалюйце ў дэталях вобласць яе дзейнасці.

— Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства па аэранавігацыйным абслугоўванні паветранага руху «Белаэранавігацыя» было створана ў 1996 годзе ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 04 красавіка 1995 года № 126. Што ж датычыцца непасрэдна дзейнасці нашага дзяржаўнага прадпрыемства, то яна вельмі маштабная і шматгранная. Гэта, перш за ўсё, абслугоўванне паветранага руху з выкарыстаннем сучасных аўтаматызаваных сродкаў кіравання, удасканаленне выкарыстання паветранай прасторы, забеспячэнне эканамічнага, рэгулярнага і бяспечнага патоку паветраных суднаў, а таксама прадастаўленне рознабаковай аэранавігацыйнай інфармацыі.

Асаблівая ўвага «Белаэранавігацыяй» надаецца такім важным пытанням, як пашырэнне сеткі паветраных трас, павышэнне прапускной здольнасці паветранай прасторы, эфектыўнасці яе выкарыстання і, у першую чаргу, бяспекі палётаў.

Ва ўсіх абласных гарадах ёсць філіялы прадпрыемства: гэта аэрапорты «Брэст», «Магілёў», «Віцебск», «Гомель» і «Гродна». Яны абсталяваны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі назірання, навігацыі і сувязі. Аэрапорты з'яўляюцца міжнароднымі і прымаюць практычна ўсе тыпы паветраных суднаў, у тым ліку самалёты замежнай вытворчасці.

— Сапраўды, аб'ём важных задач, якія вырашаюцца, уражвае. Асабліва калі ўлічваць транзітны статус нашай краіны, яе геаграфічнае становішча. Што ж сёння ўяўляе сабой беларускае неба ў лічбах і фактах?

— Праз паветраную прастору Беларусі праходзяць найкарацейшыя паветраныя шляхі з Заходняй Еўропы на Усход і ў Паўднёва-Усходнюю Азію, са Скандынаўскага рэгіёна на поўдзень і ў Міжземнамор'е. Сёння ў нашым небе ажыццяўляюць рэйсы самалёты больш як 1000 авіякампаній з 93 краін свету. Кожныя суткі над Рэспублікай Беларусь здзяйсняюць палёт ад 600 да 950 паветраных суднаў, за год — больш як 200 тысяч. Бяспеку руху гэтага вялізнага патоку авіялайнераў забяспечваюць нашы спецыялісты.

Колькасць авіякампаній штогод павялічваецца дзякуючы высокай якасці аэранавігацыйнага абслугоўвання, выкарыстанню сучасных сродкаў назірання, навігацыі і сувязі, гатоўнасці ўсіх аэрадромаў Рэспублікі Беларусь прымаць і абслугоўваць міжнародныя рэйсы, а таксама выгаднаму геаграфічнаму становішчу краіны. Кожнаму з авіялайнераў, якія пралятаюць над нашай краінай, даецца дазвол на выкарыстанне паветранай прасторы, аказваюцца адпаведныя аэранавігацыйныя паслугі.

Часцей за іншых у небе Беларусі гасцююць самалёты авіякампаній Расіі, Германіі, Аўстрыі, Францыі. Усе яны з'яўляюцца нашымі кліентамі. Паветранай прасторай Рэспублікі Беларусь кіруе Мінскі раённы дыспетчарскі цэнтр, МАДЦ (Мінскі аэрадромна-дыспетчарскі цэнтр), а таксама службы паветранага руху на абласных аэрадромах грамадзянскай авіяцыі. Займаючыся ўсімі «транзітнымі» самалётамі, беларускія спецыялісты працуюць у цесным кантакце з варшаўскімі, вільнюскімі, рыжскімі, львоўскімі, маскоўскімі, кіеўскімі калегамі, што дазваляе пастаянна ўдасканальваць структуру палётных трас і занальнай навігацыі. Дзякуючы ўзгодненым дзеянням палёты суднаў ажыццяўляюцца па самых кароткіх адлегласцях на эканамічных вышынях і рэжымах палётаў.

Сёння паветраная сфера, размешчаная над тэрыторыяй Беларусі, уключае 59 маршрутаў занальнай навігацыі. Працягласць сеткі маршрутаў складае больш за 27 тысяч кіламетраў. Кіраванне паветраным рухам ажыццяўляецца на плошчы 207,6 кв. км.

— У век глабалізацыі і паўсюднага ўкаранення новых тэхналогій, мусіць, можна з упэўненасцю гаварыць пра тое, што беларускія спецыялісты ў галіне аэранавігацыі і забеспячэння бяспекі палётаў паспяхова ўпісаліся ў агульнасусветную канцэпцыю паветранага руху?

— Нашым прадпрыемствам вядзецца пастаянная мэтанакіраваная праца па ўзаемадзеянні з міжнароднымі авіяцыйнымі арганізацыямі з мэтай канчатковага пераходу на агульнасусветныя стандарты. Супрацоўніцтва з Міжнароднай арганізацыяй грамадзянскай авіяцыі (ІКАА) і Еўракантролем дазволіла ўкараніць шэраг ключавых міждзяржаўных праграм, якія зрабілі паветраную прастору Беларусі яшчэ больш прывабнай для авіякампаній і значна павысілі ўзровень бяспекі палётаў у нашым небе.

Дзякуючы выкарыстанню сучаснай аэрадромна-раённай аўтаматызаванай сістэмы кіравання паветраным рухам «Сінтэз АР-2», у якой цалкам рэалізаваны пакет рэкамендацый Еўракантролю і ІКАА па інтэрфейсе «чалавек — машына», мінімальныя інтэрвалы гарызантальнага эшаланіравання паміж самалётамі скарочаны з 30 да 10 кіламетраў.

Паветраная сфера, размешчаная над тэрыторыяй Беларусі, уключае 59 маршрутаў занальнай навігацыі. Працягласць сеткі маршрутаў складае больш за 27 тысяч кіламетраў. Кіраванне паветраным рухам ажыццяўляецца на плошчы 207,6 кв. км.

У момант падпісання беларуска-французскіх пагадненняў.

Актыўная праца спецыялістаў прадпрыемства па развіцці аэранавігацыйнага абслугоўвання ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і рэкамендацыямі дазваляе нам упэўнена глядзець у будучыню і быць лідарамі ў аказанні аэранавігацыйных паслуг у паветранай прасторы краін СНД. Дарэчы, не так даўно «Белаэранавігацыя» была прызнана Лаўрэатам міжнароднай прэміі і ўзнагароджана Знакам пашаны «Лідар нацыянальнай эканомікі», а ў 2011 годзе адзначана Міждзяржаўным авіяцыйным камітэтам «За дасягненні ў галіне арганізацыі паветранага руху на аснове ўкаранення міжнародных стандартаў».

— Нягледзячы на паўсюдны тэхнічны прагрэс і аўтаматызацыю працы лётна-тэхнічнага персаналу нельга не ўлічваць варыянтаў найгоршага развіцця падзей у небе — разнастайных лётных здарэнняў. Чым адкажаце на выклік лёсу, калі раптам здарыцца непрадбачанае?

— У адпаведнасці з Міжнароднымі стандартамі і Рэкамендаванай практыкай ІКАА створаны Каардынацыйны цэнтр пошуку і выратавання (КЦПВ) дзяржаўнага прадпрыемства «Белаэранавігацыя». КЦПВ з'яўляецца органам, які нясе адказнасць за аказанне садзейнічання эфектыўнай арганізацыі дзейнасці авіяцыйных пошукава-выратавальных работ у межах раёна пошуку і выратавання. Раён адказнасці КЦПВ — тэрыторыя Рэспублікі Беларусь (Мінскі раён палётнай інфармацыі).

КЦПВ таксама з'яўляецца адзіным пунктам сувязі па прыёме аварыйных сігналаў Міжнароднай спадарожнікавай сістэмы пошуку аварыйных суднаў. Асноўная дзейнасць спецыялістаў цэнтра накіравана на аказанне паслуг па авіяцыйным пошуку і выратаванні, мэта якіх — аказанне своечасовай дапамогі пасажырам і экіпажам паветраных суднаў, што знаходзяцца ў аварыйнай сітуацыі.

— Тэхнічная абсталяванасць «Белаэранавігацыі», пастаяннае ўкараненне розных інавацый, безумоўна, выклікаюць павагу. Аднак кіруе звышскладанай апаратурай усё ж чалавек. Хацелася б ведаць, па якіх кірунках на вашым прадпрыемстве вядзецца праца з персаналам?

— Несумнеўным фактарам, які ўплывае на бяспеку палётаў, з'яўляецца ўзровень кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу. Сёння на прадпрыемстве «Белаэранавігацыя» задзейнічаны больш як 1800 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Павышэнне прафесійнай падрыхтоўкі персаналу ажыццяўляецца пры цесным узаемадзеянні з Мінскім дзяржаўным вышэйшым авіяцыйным каледжам (МДВАК), Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2011 года, згодна з патрабаваннямі ІКАА і Праграмы ўкаранення стандартаў ІКАА да ўзроўню валодання авіядыспетчарамі англійскай мовай, дыспетчарскі персанал, які кіруе паветраным рухам, павінен свабодна валодаць англійскай мовай. У сувязі з гэтым адбылася падрыхтоўка па курсе англійскай мовы больш як 200 спецыялістаў прадпрыемства ў МДВАК і навучальнай установе Англіі (MLS International College).

Акрамя таго, на прадпрыемстве ўкараніны трэнажорны комплекс, які дазваляе дыспетчарскаму і інструктарскаму саставу адпрацоўваць практычныя навыкі ва ўмовах аварыйнай абстаноўкі ў палёце і пры ўзнікненні непрадбачаных сітуацый.

— У сувязі з высокай прафесійнай нагрузкай вольнаму часу супрацоўнікаў таксама надаецца належная ўвага?

— Дзяржаўнае прадпрыемства «Белаэранавігацыя» арганізуе адпачынак супрацоўнікаў прадпрыемства на базе аздараўленчага комплексу «Ракета». Гэта тэрыторыя здароўя з уласным басейнам, спартзалай, гульнявымі пляцоўкамі для розных відаў спорту, капітальнымі карпусамі і ўтульнымі нумарамі. Тут трэніруецца футбольная каманда «Белаэранавігацыі». Рэгулярнае правядзенне спартакіяд у розных відах спорту для ўсіх падраздзяленняў нашага прадпрыемства ўмацоўвае карпаратыўны дух персаналу, а таксама прапагандуе актыўны здаровы лад жыцця. Усё гэта, несумненна, уплывае на якасць працы спецыялістаў, якія, удасканальваючы сістэму кіравання паветранай прасторай Рэспублікі Беларусь, дазваляюць «Белаэранавігацыі» быць адным з вядучых прадпрыемстваў у сферы аказання навігацыйных паслуг у паветранай прасторы Еўропы і краін СНД.

Дыспетчарскі пост.



Сёння ў нашым небе ажыццяўляюць рэйсы самалёты больш як 1000 авіякампаній з 93 краін свету. Кожныя суткі над Рэспублікай Беларусь здзяйсняюць палёт ад 600 да 950 паветраных суднаў, за год — больш як 200 тысяч. Бяспеку руху гэтага вялізнага патоку авіялайнераў забяспечваюць спецыялісты РУП «Белаэранавігацыі».

УНП 100035788

Будынак РУП «Белаэранавігацыя».

Аэрапорт «Брэст».

Аэрапорт «Віцебск».

Аэрапорт «Гомель».

Аэрапорт «Гродна».

Аэрапорт «Мінск».

Аэрапорт «Магілёў».

Аздараўленчы комплекс «Ракета» пад Мінскам.

НЕРУДПРОМ

Задача «простая» — даць Мінску і сталічнай вобласці

НЯРУДНЫЯ БУДАЎНІЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Карэспандэнты «Звязды» гутараць з генеральным дырэктарам ААТ «Нерудпрам» Міхаілам ДУБОВЫМ

Адкрытае акцыянернае таварыства «Нерудпрам», што размешчана на сталічнай вуліцы Асаналіева, з'яўляецца адным з буйнейшых вытворцаў і асноўным пастаўшчыком нярудных матэрыялаў для будаўнічага комплексу Мінска і сталічнай вобласці. Гэта сучаснае горнае прадпрыемства з больш чым 65-гадовай біяграфіяй, у склад якога ўваходзяць некалькі драбільна-сартавальных заводаў, аснашчаных высокапрадукцыйнай землярыйнай і пагрузачнай тэхнікай. Прадукцыя гэтых заводаў — пясок, гравій і шчабёнка — выкарыстоўваецца ў вытворчасці жалезабетонных канструкцый для жыллёвага і прамысловага будаўніцтва, прымяняецца пры вытворчасці сухіх будаўнічых сумесяў і растворaў, вырабе тратуарнай пліткі, бардзюраў, будаўніцтве аўтамабільных дарог, аэрадромаў, для добраўпарадкавання тэрыторый і г.д. А без кварцавых фільтруючых пяскоў не абысціся на ачышчальных збудаваннях мегаполіса.

Генеральны дырэктар ААТ «Нерудпрам» Міхаіл ДУБОВЫ.

Брыгады «Нерудпрама» ў свой час дапамагалі братняму народу Арменіі перажыць наступствы разбуральнага землятрусу 1989 года. Непасрэдны ўдзел у тых далёкіх падзеях прымаў і наш сённяшні суразмоўца. Ён успамінае, што ўмовы працы былі вельмі складанымі. У кар'еры на беразе бурнага Церака было працэнтаў 70 каменю, галечніку і толькі 30 — так неабходнага пяску. Тым не менш, «мы пабудавалі завод і забяспечвалі яго прадукцыяй беларускія арганізацыі ўвесь час, пакуль яны там працавалі».

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Міхаіл Міхайлавіч Дубовы родам з Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці.

Пасля заканчэння знакамітага наргаса тры гады працаваў бухгалтарам-рэвізорам у Міністэрстве прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР, і гэты час стаў добрай жыццёвай і прафесійнай школай. На «Нерудпрам» прыйшоў адразу галоўным бухгалтарам. У той час у прадпрыемства быў свой філіял у Самаркандзе, адкуль на працягу дзесяці гадоў пастаўлялі мармур для будаўніцтва Мінскага метрапалітэна. Як вядома, «Усход — справа тонкая», і каб дабіцца дакладнага ўліку фінансавых сродкаў і матэрыялаў, маладому галоўнаму бухгалтару давялося самому неаднаразова адпраўляцца ў далёкія камандзіроўкі. Праз некаторы час пасля закрыцця філіяла і перадачы кар'ера Узбекістану прыняў не менш клопатныя абавязкі галоўнага эканаміста, потым — і намесніка дырэктара па эканоміцы.

Калектыў узначаліў у складаны час — у 1999 годзе. Зазначым, што гэта даволі рэдкі выпадак, калі дырэктарам становіцца не галоўны інжынер альбо іншы «чыста вытворца», а прафесійны эканаміст. Магчыма, якраз гэта дапамагло калектыву ў бескампрамісных умовах рынку не толькі ўтрымацца на плыву, але і пастаянна нарошчваць вытворчыя тэмпы. І эфектыўна працаваць і сёння.

На ўчастку аднаго з драбільна-сартавальных заводаў.

— Мінулы год быў даволі складаным для айчыннай эканомікі і для эканомік большасці іншых краін. Як ён склаўся для вас?

— Вынікі мінулага года можна ацаніць на чатыры з мінусам, калі браць па пяцібальнай сістэме. Паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця ў асноўным выкананы. Аб'ём вытворчасці па асноўнай наменклатуры склаў 4926 тыс.м^3. Гэта крыху больш за планавае заданне. Кажуць, што ўсё пазнаецца ў параўнанні. Калі я прыйшоў працаваць дырэктарам, прадпрыемства выпускала 1 мільён 500 тыс. метраў кубічных нярудных матэрыялаў у год. На 2013 год задача — больш за 5 мільёнаў кубаметраў. Такі вось рывок за 13 гадоў. Паказальна, што 85% нашай прадукцыі выкарыстоўвае сталіца.

Летась перавысілі паказчыкі рэнтабельнасці продажу, паказчыкі зніжэння ўзроўню матэрыялаёмістасці, энергазберажэння, эканоміі рэсурсаў. І больш чым у два разы перакрылі паказчык інвеставання ў асноўны капітал.

Валавы дабаўлены кошт за 2012-ы да папярэдняга года ў бягучых цэнах склаў 170,1%. Неблагі паказчык, але планавалі 190-195%. Крыху не дацягнулі, таму і выстаўляем сабе тую самую чацвёрку з мінусам. Прадукцыйнасць працы па валавым дабаўленым кошце ўзрасла на 182%.

Выкананы значныя аб'ёмы работ па рэкультывацыі асвоеных радовішчаў. Пасля сябе пакідаем землі, прыгодныя для вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці, пад пасадку лясоў ці арганізацыю зон адпачынку.

Што тычыцца гэтага года, то партфель заказаў сфарміраваны, кліенты ў нас пастаянныя. Яны ведаюць нашы магчымасці, а мы ведаем іх патрэбы.

— У вас ёсць свая спецыфіка. Вы прыходзіце на радовішча пяскоў, ставіце там завод, але праз некаторы час рэсурс кар'ера вычарпаны і патрэбна некуды пераязджаць...

— На працягу трох-чатырох бліжэйшых гадоў давядзецца спыніць два дастаткова буйныя заводы — а гэта палова нашых вытворчых магутнасцяў. Будуць цалкам выпрацаваны тыя радовішчы, на базе якіх яны працуюць. Калі канкрэтна, то плануецца выбыццё радовішчаў «Векшычы» пад Заслаўем і кар'ера «Волма» ў Пухавіцкім раёне, і патрэбна інтэнсіўна асвойваць новыя.

Мы пра гэта, вядома ж, ведалі зараней і таму адпаведным чынам рыхтуемся. Асвойваем буйное радовішча «Мінскае», што ў Лагойскім раёне. На гэтыя мэты накіравалі 60 мільярдаў рублёў уласных сродкаў. Дзякуючы чаму пабудавалі там і працягваем узводзіць сіламі сваёй будаўнічай брыгады новы драбільна-сартавальны завод. Яго першая чарга ўжо працуе. Другая чарга, у адпаведнасці з графікам, уступае ў строй у пачатку года. Там ужо прадугледжана і стадыя драблення камення, таму на патоку шчабёнка дробнай фракцыі. Летам пусцім трэцюю чаргу — па вытворчасці шчабёнкі вельмі дробнай фракцыі з прамыўкай, і ў выніку завод будзе выпускаць два мільёны метраў кубічных патрэбнай народнай гаспадарцы прадукцыі.

Рамонт тэхнікі даручаны такім вопытным аўтаслесарам, як Алег ВАЛАДЗЬКО.

Абсталяванне там часткова новае. Таксама мы выкарыстоўваем механізмы са свайго закрытага прадпрыемства. Яны ў добрым стане, дастаткова высокапрадукцыйныя, і было б не па-гаспадарску не прадоўжыць тэрмін службы яшчэ на многія гады. Іншая справа, што спатрэбіліся нейкія дадатковыя ўдасканаленні, адаптацыя да канкрэтных умоў і канкрэтнай сыравіны. Але ў нас граматныя тэхнічныя службы, і яны з гэтай задачай справіліся. Такім чынам, мы сэканомілі сур'ёзныя сродкі.

На «Мінскім» запланавана таксама ўзвядзенне адміністрацыйнага будынка з бытавымі ўмовамі для працуючых. Бо, акрамя чыста вытворчага персаналу, як і на іншых нашых прадпрыемствах, ёсць рамонтнікі, энергетыкі і іншыя службы. А таму будзе сталовая, душавыя, спецыяльныя пакойчыкі, каб пераапрануцца, і гэтак далей. Кадры ў асноўным мясцовыя. Яны праходзяць адпаведную падрыхтоўку на вучэбна-курсавым камбінаце па прафесіях драбільшчыка, грахатоўшчыка і іншых даволі рэдкіх. Працуюць і мінчане, спецыяльна выдзеленыя аўтобусы збіраюць іх па горадзе і развозяць да месца работы.

Шчыра кажучы, адчуваецца кадравы дэфіцыт, асабліва грамотных машыністаў экскаватараў, бульдозераў і аўтагрэйдараў — наогул механізатараў. І ён прымусіў шукаць нейкія чыста тэхнічныя рашэнні. Назаву адно: набываем перасоўныя сартавальныя ўстаноўкі, якія даюць даволі высокую прадукцыйнасць, а абслугоўваюць іх толькі тры чалавекі. Размешчаны яны непасрэдна ў кар'ерах, сыравіна паступае адразу на ўстаноўку, без удзелу аўтатранспарту, і дасягаецца сур'ёзная эканомія сродкаў.

Дзве такія ўстаноўкі ўжо працуюць, правялі тэндар на трэцюю. Еўрапейскі вопыт паказвае, што за імі — вялікае вытворчае будучае.

Займаемся і паўстацыянарным заводам з поўнай прамыўкай, прадукцыйнасцю на адзін мільён нярудных матэрыялаў. А мы пясок, між іншым, дае нашым карыстальнікам 15% эканоміі цэменту. Збіраецца такі завод з модуляў, таму ўзводзіцца значна хутчэй за стацыянарны. І ён таксама мабільны, пасля асваення аднаго радовішча перакідваецца на іншае.

Заводы працуюць і ў зімовы перыяд. Хаця зараз, асабліва ў маразы, прадукцыйнасць драбільна-сартавальных установак, безумоўна, зніжаецца. Калі летам мы адгружаем прыкладна 20 тысяч метраў кубічных прадукцыі ў суткі, то зараз, зімой, — 10-12 тысяч. Яшчэ і таму, што многія растворныя вузлы нашых кліентаў працуюць на адкрытым паветры і ўзімку стаяць. Існуе пэўная тэхналагічная залежнасць ад надвор'я і ў нас, але тут на першы план выступае майстэрства кадраў.

— Ці можна сказаць, што пастаянна вядзецца не толькі рэструктурызацыя вытворчасці, але і мадэрнізацыя абсталявання, удасканальваюцца самі тэхналогіі?

— За апошні час мы набылі два высокапрадукцыйныя кар'ерныя экскаватары «Хундаі», некалькі пагрузчыкаў — кітайскіх і вытворчасці нашага завода «Ударнік». Растуць аб'ёмы, і без тэхнічнага пераўзбраення нельга абысціся. А што тычыцца тэхналогій... Вы разумееце, калі будуецца новы завод, то працуе ён ужо з улікам наватарскіх, прагрэсіўных тэхналогій, дзякуючы чаму пашыраецца таксама і асартымент выпускаемай прадукцыі. Напрыклад, мы павялічваем выпуск пяскоў дробнай фракцыі, і гэта лічым для сябе сапраўдным «залатым дном». Скажам, адсартаваны па фракцыях і затараны ў мяшкі пясок для басейнаў і артэзіянскіх свідравін каштуе ў некалькі разоў даражэй, чым звычайны.

Сёлета на драбільна-сартавальным заводзе «Мінскі» плануем пачаць выпуск пяску вельмі дробнай фракцыі — ад 0,16 мм да 1 мм. Ён будзе выкарыстоўвацца, у прыватнасці, для тынковачных работ, а ў далейшым — для вытворчасці сухіх будаўнічых сумесяў. З гэтай мэтай набудзем даволі дарагое прагрэсіўнае абсталяванне вядомай чэшскай фірмы. У наступным дабавяцца пяскі яшчэ дзвюх, як мінімум, ці трох фракцый.

— Калі ласка, пагаворым на тэму якасці.

— На прадпрыемстве дзейнічае сістэма менеджменту якасці. Уся наша прадукцыя прайшла адпаведную сертыфікацыю. А некаторыя яе віды атэставаны на Еўрастандарт, па еўрапейскай сістэме якасці. У свой час нашы спецыялісты пабывалі за мяжой, падрабязна вывучалі нямецкі вопыт, пасля чаго на «Заслаўі» сертыфікавалі, згодна з Еўрастандартам, дробны запаўняльнік, які выкарыстоўваецца пры выпуску бетонных вырабаў на экспарт. Зараз працуем у гэтым кірунку з прадукцыяй, што вырабляем на радовішчы «Мінскае». Ушчыльную праблемай займаюцца спецыялісты вытворча-тэхнічнага аддзела.

(Зазначу, што маем сертыфікат не толькі на здабычу, абагачэнне і вытворчасць нярудных будаўнічых матэрыялаў, але і на сістэму кіравання аховай працы пры распрацоўцы пясчаных і гравійных кар'ераў, і нават на раслінаводства ў спалучэнні з жывёлагадоўляй, бо адно з нашых вытворчых падраздзяленняў — чыста сельскагаспадарчы філіял са сваёй зразумелай спецыфікай і сваімі вытворчымі задачамі.)

Не часта бывае, што ў кар'еры пясок такой высокай якасці, што не патрэбна далейшая дапрацоўка. Такія ўнікальныя радовішчы, галоўным чынам, даўно выбраны, і пяскі даводзіцца сартаваць (на кар'ерах стаяць сартавальныя ўстаноўкі, на якіх адсейваецца камень і наогул буйная фракцыя), абагачаць. А моцна загліненыя (гліністыя) пяскі прамываем, бо нават дробныя часцінкі гліны не дазваляюць дасягнуць высокай якасці бетонаў. Нашы тэхналогіі нічым не адрозніваюцца ад еўрапейскіх, за апошнія сто гадоў у здабычы мала што змянілася. Розніца толькі ў тым, што ў Еўропе, у той жа Германіі, пераважаюць пясчана-гравійныя радовішчы, а ў нас, галоўным чынам, пясчаныя. Тым не менш, калі з'яўляюцца тэхналагічныя навінкі, мы пра іх ведаем і прымяняем у сябе.

Магутная тэхніка працуе ў кар'ерах ААТ «Нярудпрам». У такім экскаватарным каўшы змяшчаецца да пяці кубаметраў грунту.

На кожным кар'еры за якаснымі параметрамі прадукцыі ўважліва сочаць майстры змен, якія непасрэдна адказваюць за выпуск прадукцыі, а таксама інжынеры па якасці, лабаранты. На ўсіх асноўных этапах бяруцца тэхналагічныя пробы, і сваё заключэнне робяць лінейныя лабараторыі. Пасля чаго на прадукцыю выпісваецца пашпарт. На пастаяннай аснове карыстаемся і паслугамі галаўной лабараторыі Інстытута будаўнічых матэрыялаў (НІІСМа), у іх на ўзбраенні самае сучаснае абсталяванне.

— З чым звязваеце перспектывы калектыву, Міхаіл Міхайлавіч?

— Перш за ўсё з асваеннем запасаў на радовішчы «Мінскае» (а гэта каля 100 мільёнаў кубаметраў). Там паралельна з трыма чэргамі дзеючага завода будзем будаваць яшчэ адзін, паўстацыянарны завод на лёгкіх фундаментах. Больш непасрэдна пад Мінскам запасаў пяску няма, таму замацавалі за сабой яшчэ два радовішчы ў Лагойскім раёне. У перспектыве пойдзем і на іх. Праўда, спатрэбіцца будаваць дарогі.

— Але ў народнагаспадарчым комплексе існуе пастаянная патрэба ў вашай прадукцыі. Давядзецца па-максімуме выкарыстоўваць усе наяўныя рэзервы, у тым ліку ўнутраныя?

— Мы не супраць, і ў гэтым кірунку пастаянна прыкладаем намаганні. Працаваць больш паспяхова нам дапамагло б вырашэнне шэрагу вытворчых і адміністрацыйна-арганізацыйных праблем. Напрыклад, ёсць цяжкасці з вялікагрузным транспартам на тэхналагічных перавозках — раскрыўных работах, перавозцы пароды ў бункеры і г.д. Штодзень патрэбна 70-80 вялікагрузных машын, бо ў суткі перамяшчаем прыкладна 60-70 тысяч тон грузаў. Аўтакамбінаты горада, з якімі прадуктыўна супрацоўнічаем шмат гадоў, на жаль, не могуць цалкам забяспечыць такія аб'ёмы. Летась пасля таго, як частку машын знялі на будаўніцтва дарогі, у іх не хапіла для нас патрэбнай тэхнікі. І па гэтай прычыне мы ўсё лета працавалі на няпоўную магутнасць, не выканалі аб'ёмы і панеслі страты, у пэўным сэнсе падвялі сваіх дзелавых партнёраў.

Яшчэ адна праблема звязана з адводамі зямель пад распрацоўку: занадта доўга цягнуцца ўзгадненні. Мы разумеем, што ў кожнай з зацікаўленых арганізацый, якія даюць дазвол, ёсць законны месяц на разгляд. Але месяцы складаюцца ў гады, бо інстанцый не менш за дваццаць, і працэдура цягнецца да двух, а то і трох гадоў. Мы не можам своечасова пачаць раскрыўныя работы, наогул весці паўнавартасную падрыхтоўку вытворчасці. Але калі нарэшце прайшлі ўсе ўзгадненні, пачынаецца сапраўдная спешка, неапраўдана ўзрастаюць нагрузкі на людзей і абсталяванне. Даводзіцца нават скарачаць рамонтныя цыклы.

Перашкаджае нераўнамернасць попыту на нашы матэрыялы: зімой ён істотна зніжаецца. Свайго піку дасягае чамусьці ў верасні, кастрычніку, нават лістападзе. Па гэтай прычыне наш вытворчы канвеер крыху ліхарадзіць, здараецца затаварванне складоў.

— Дазвольце адно «балючае» пытанне, Міхаіл Міхайлавіч. Летась у вас адбыўся даволі адчувальны адток кадраў. У чым тут справа?

— Пачнём з таго, што мы ў Мінску ў добрым сэнсе манапалісты, і цэны на прадукцыю нам вызначае дзяржава ў асобе Мінгарвыканкама. Так што гэта дзяржаўныя цэны. У прыватных кар'ерах яны намнога вышэйшыя. Летась новыя цэны нам угаднілі толькі ў маі, таму не было прыбытку. Значыць, не маглі павысіць заробкі, і звольнілася 10-я частка калектыву. Пайшлі неблагія спецыялісты — а ў нас горнае прадпрыемства, збоку не вельмі возьмеш, патрэбна адпаведная падрыхтоўка.

Пажадана, каб нам больш аператыўна ўзгадняліся цэны на прадукцыю, бо гэта, як бачым, напрамую ўплывае і на забяспечанасць вытворчых падраздзяленняў кадрамі. Сёння старэйшыя пакаленні ідуць на заслужаны адпачынак, а моладзь не спяшаецца заняць іх месцы за рычагамі экскаватараў і бульдозераў. Работа часцей за ўсё за горадам, пры любым надвор'і, і патрэбна альбо быць рамантыкам, альбо атрымліваць за яе нармальныя грошы. Такую мэту — даць калектыву магчымасць нармальна працаваць і няблага зарабляць — мы ставім перад сабой пастаянна. Зараз зарплата набліжаецца да сямі мільёнаў рублёў. Не «амерыканскія» заробкі, але сям'ю карміць можна.

Начальнік аддзела фінансавай работы Наталля МУСАТАВА (першая справа), эканаміст Святлана БЕНАРАДСКАЯ і вядучы праграміст Ала САЛАВЕЙ.

Кадравай праблеме наогул надаём вялікую ўвагу. Стараемся на кіруючыя пасады вылучаць уласныя кадры. Напрыклад, параўнальна нядаўна галоўным інжынерам прызначаны Сяргей Шакураў. Сяргей Міхайлавіч на нашым прадпрыемстве прайшоў фактычна ўсе прыступкі службовай лесвіцы, пачынаў рабочым. Працяглы час працаваў у вытворча-тэхнічным аддзеле, узначальваў яго. Апошнія два гады кіраваў маладым калектывам «Мінскага» — а гэта вельмі вялікі і адказны ўчастак работы.

Імкнёмся амалодзваць калектыў, хоць у нашых «палявых» умовах гэта не так проста, пра што я ўжо казаў. І ў той жа час стараемся захоўваць праверaныя кадры, якія добрасумленна і эфектыўна выконваюць сваю работу не адзін дзясятак гадоў. Напрыклад, ветэрану вытворчасці экскаваторшчыку Сяргею Пятровічу Кулакову з «Заслаўя» крыху за семдзесят, а працуе па-ранейшаму з задавальненнем. І шчыра кажучы, замяніць такіх асаў не проста. Безумоўна, зараз на першы план выступае фактар дастатковай забяспечанасці навейшай, высокапрадукцыйнай тэхнікай, і мы не шкадуем сродкаў на яе набыццё. Але пра людзей па-ранейшаму павінны думаць і клапаціцца.

Ад рэдакцыі. Творчая брыгада «Звязды» выказвае шчырую ўдзячнасць галоўнаму інжынеру Сяргею Міхайлавічу Шакураву, намесніку генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Валерыю Яўгенавічу Ігнатовічу, спецыялісту тэхаддзела Віктару Іванавічу Яфіменку за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.

УНП 100016844

• Пагрузка гатовай прадукцыі.

• Там, дзе былі кар'еры, пасля рэкультывацыі з'яўляюцца палеткі, прыдатныя для землекарыстання, альбо вось такія маляўнічыя азёры.

• Галоўны маркшэйдар Валерый ПАНАСЮК (у цэнтры) з калегамі Таццянай БАРКОЎСКАЙ і Сяргеем КАЛЕСНІКАВЫМ.

ААТ «Белсантэхмантаж-2»:

«Наш дэвіз — ХУТКАСЦЬ, НАДЗЕЙНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ»

«Мы — лідары ў сферы будаўніча-мантажных работ», — з упэўненасцю могуць заявіць супрацоўнікі і кіраўніцтва гэтай арганізацыі. Могуць, але не заяўляюць. Проста таму, што на доўгія размовы няма часу. Працы ў іх стабільна многа, а якасць зробленых работ найлепш за прамовы характарызуе яе выканаўцаў. Знаёмцеся: ААТ «Белсантэхмантаж-2».

Ад першай асобы

Генеральны дырэктар ААТ «Белсантэхмантаж-2» Валерый Данілovіч пустых размоў таксама не любіць, аддаючы перавагу справе. Таму на просьбу абагульніць усё сказанае вышэй толькі ўсміхаецца: «Што дадаць? Хіба толькі тое, што мы заўжды адкрыты да супрацоўніцтва і гатовы выканаць сантэхнічныя работы любой складанасці на самым высокім узроўні. Наша прадпрыемства — надзейны партнёр, здольны вырашыць практычна любыя пастаўленыя задачы».

Дарэчы, Валерый Вікенцьевіч сціпла змоўчвае, што менавіта з яго прыходам на прадпрыемства мадэрнізацыя вытворчасці пайшла больш хуткімі тэмпамі, вырас сярэдні заробак супрацоўнікаў і павялічыліся асноўныя паказчыкі. Нездарма ж у 2008 годзе генеральны дырэктар ААТ «Белсантэхмантаж-2» быў адзначаны высокай дзяржаўнай узнагародай — медалём «За працоўныя заслугі».

Прадукцыя на складах не ляжыць

— У нас вельмі моцная тэхнічная база, практычна ні ад каго не залежым, — адзначаюць супрацоўнікі ААТ «Белсантэхмантаж-2». Сапраўды, у арэнду бярэцца хіба што тэхніка для працы на вышыні. Усім астатнім абсталяваннем, механізаваным і ручным інструментам, неабходным для выканання мантажных работ высокай якасці, прадпрыемства забяспечвае сябе самастойна. Таксама, як і большасцю камплектуючых.

Заводы таварыства маюць сваю спецыфіку: іх прадукцыя не рознічная, яна прызначана спецыяльна для мантажных упраўленняў. Прычым каля 50% заказаў складаюць пабочныя будаўнічыя арганізацыі, так што Мінскі завод «СанТэхДэталь» і Гродзенскі завод сантэхзагатовак не толькі забяспечваюць патрэбы таварыства, але і прыносяць яму адчувальны прыбытак. Гэты варыянт, адзначаюць у галаўным офісе арганізацыі, найлепшы для ўсіх. Прадукцыя вырабляецца па канкрэтных заказах, на складах запасаў практычна не ляжыць. Пры гэтым аб'ёмы вытворчасці пастаянна нарошчваюцца.

Што менавіта вырабляюць прадпрыемствы? Найперш трубныя загатоўкі складаналй канфігурацыі і вентыляцыйныя сістэмы для аб'ектаў прамысловага і грамадскага прызначэння, сантэхнічную прадукцыю, вузлы ацяплення і водазабеспячэння, металаканструкцыі. Гродзенскі завод, адзін з нямногіх у краіне, спецыялізуецца на выпуску папярэдне ізаляваных труб для цеплатрас. «Сантэхдэталь» ужо год, як засвоіў выпуск новага віду прадукцыі — прыточкавых камер для сістэмы вентыляцыі.

Зразумела, каб забяспечваць стабільна высокую якасць прадукцыі і вытрымліваць канкурэнцыю ў гэтай сферы, неабходна і самім пастаянна ўдасканальвацца: вывучаць замежны вопыт, абнаўляць станочны «парк». Штогод заводы набываюць неабходнае абсталяванне. Напрыклад, на заводзе «Сантэхдэталь» метал раскройвае робат — усталяваны плазменныя ўстаноўкі, ёсць сучасныя станкі, якія адразу з металічных палосаў скручваюць вентыляцыйныя трубы; ёсць адмысловы цэх, дзе ўстаноўка наносіць на металічныя вырабы палімернае пакрыццё. Выраб набывае не толькі прывабны выгляд, але таксама трываласць і даўгавечнасць.

Якасць вытворчасці строга кантралюецца. Адну з такіх праверак, на адпаведнасць паветраводаў стандарту СТБ 1915-2008, мы заспелі якраз падчас свайго візіту на завод. У праверцы ўдзельнічаюць прадстаўнікі кіраўніцтва ААТ — у галаўным офісе акрэдытавана лабараторыя, спецыялісты якой маюць права здзяйсняць падобны кантроль. «Бачыце, рабочы замацоўвае на выпрабавальным стэндзе паветравод (нармальнай шчыльнасці ці шчыльны), — тлумачыць нам працэс галоўны інжынер завода «Сантэхдэталь» Аляксандр Мігура. — Пад пэўным ціскам мы падаём паветра, адсочваем з дапамогай адмысловага датчыка яго расход, страту і параўноўваем вынікі з табліцай якасці. Калі выпрабаванне пройдзена здавальняюча, значыць, паветравод якасны і яго можна ставіць у вентыляцыйную сістэму. Падобныя праверкі праводзім раз на год, выбіраючы проста з вытворчай лініі любую дэталь». Цягам апошніх трох гадоў, што вядзецца гэты кантроль, падзення якасці зафіксавана не было.

— Увесь калектыў працуе зладжана, але пра некаторых супрацоўнікаў асабліва хочацца сказаць цёплыя словы, — працягвае Аляксандр Пятровіч. — На ўчастку вентыляцыі, прыкладам, працуе брыгадзір Мікалай Станіслававіч Семянюк. Пры тым, што ён даволі малады — 45 гадоў, гэта вельмі вопытны спецыяліст, на якім трымаецца ўчастак і ўся моладзь у яго вучыцца. Безумоўна, пры такім стаўленні да працы і заробак у яго добры — да 10 мільёнаў рублёў, што таксама стымулюе маладыя кадры набірацца вопыту і працаваць з большай адказнасцю і аддачай. Ёсць у нас таксама людзі, якія ўсё жыццё працавалі на нашым прадпрыемстве, дый цяпер, знаходзячыся на пенсіі, працягваюць працаваць, як Мікалай Пятровіч Якубовіч. Ён пачынаў на заводзе зваршчыкам, потым вучыўся, павышаў кваліфікацыю, быў інжынерам па тэхніцы бяспекі, а цяпер працуе кіраўніком фарбавальнага ўчастка. Або наш зваршчык Анатоль Паўлавіч Бандарчык, які не толькі ўсё свядомае жыццё працаваў на заводзе, але і цяпер бярэцца за самыя адказныя заказы... З іншага боку, на прадпрыемства даволі ахвотна ідзе моладзь, тым больш, мы стараемся падтрымліваць каштоўныя кадры рознымі спосабамі: ад традыцыйнай прэміі перад Новым годам і забеспячэння месцамі ў інтэрнаце да вакцынацыі супраць грыпу за кошт прадпрыемства. А як інакш, калі людзі — найважнейшы наш рэсурс.

Якасць як лад жыцця

Акцэнт на сваіх заслугах кіраўніцтва ААТ «Белсантэхмантаж-2» не робіць. Затое аб іх выразна сведчаць шматлікія дыпломы, граматы і падзякі, атрыманыя прадпрыемствам у тым ліку ад Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. А таксама водгукі шматлікіх партнёраў. «Рэкамендуем Баранавіцкае мантажнае ўпраўленне як надзейнага і высокапрафесійнага падрадчыка», — адзначаецца ў лісце ТДА «Белцепластрой». «Мы супрацоўнічаем з філіялам «Гродзенскае мантажнае ўпраўленне» цягам 30 гадоў. За ўвесь гэты перыяд філіял зарэкамендаваў сябе як надзейны і адказны субпадрадчык, не дапускаючы парушэння дагаворных абавязкаў, выканаўчая дакументацыя заўжды мела належную якасць і перадавалася ва ўсталяваныя тэрміны», — сведчыць водгук кіраўніка трэста «Гроднагарбуд». І такіх станоўчых ацэнак — вялізны стос!

А яшчэ ААТ «Белсантэхмантаж-2» пастаянна бярэ ўдзел у дабрачынных акцыях БРСМ, Чырвонага Крыжа — наведвае дзіцячыя дамы і ладзіць святы для іх выхаванцаў, дапамагае фінансава. І таксама не афішуе гэтыя справы. Проста праяўляе сацыяльную адказнасць, што па сённяшнім нялёгкім часе можа дазволіць сабе толькі сапраўды моцнае і стабільнае прадпрыемства.

Візітоўка прадпрыемства

Адкрытае акцыянернае таварыства «Белсантэхмантаж-2» — адна з найбуйнейшых спецыялізаваных будаўніча-мантажных арганізацый Беларусі, заснаваная яшчэ ў 1958 годзе.

Асноўны кірунак дзейнасці — мантажныя і будаўнічыя работы (вентыляцыя, ацяпленне, сантэхніка, водаправод, каналізацыя, цеплазабеспячэнне, кандыцыянаванне, газазабеспячэнне і холадазабеспячэнне) на аб'ектах прамысловасці, сацкультбыту, аховы здароўя, жылля і г.д.

У структуры ААТ «Белсантэхмантаж-2» дзейнічаюць 10 мантажных упраўленняў, размешчаных у Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, у тым ліку ў Мінску, Брэсце, Гродне, Барысаве, Салігорску, Баранавічах, Пінску, Лідзе. У склад таварыства ўваходзяць таксама два заводы — Мінскі «Сантэхдэталь» і Гродзенскі завод «Сантэхзагатовак», а таксама «База матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння» з аўтапаркам, «Жыллёва-камунальная кантора» ў г. Мінску і рознічная крама «Сантэхсэрвіс» у г. Гродна.

На прадпрыемстве распрацавана, укаранёна і ў 2004 годзе сертыфікавана сістэма менеджменту якасці распрацоўкі і вытворчасці санітарна-тэхнічнай прадукцыі і мантажных работ у адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ІСО 9001-2001.

Ад садкоў да стадыёнаў

Нават шыкоўны палац без сістэмы ацяплення, вентыляцыі, водазабеспячэння і водаадвядзення будзе звычайным каменным гмахам, пустым і няўтульным. Прыдатным для жыцця яго робяць менавіта гэтыя «дробязі». І, пагадзіцеся, уражанне ад наведвання самага што ні ёсць сучаснага спартыўнага ці забаўляльнага комплексу могуць сапсаваць «крыва» ўсталяваная сантэхніка ці вентыляцыя. Прычым, запэўніваюць прафесіяналы, не настолькі важна, імпартныя ці айчынныя камплектуючыя выкарыстоўваюцца, — найшмат важнейшая якасць работ. У гэтым сэнсе даць сваю ацэнку працы ААТ «Белсантэхмантаж-2» можа літаральна кожны беларус і госць краіны: дастаткова наведаць Нацыянальную бібліятэку Беларусі або храм-помнік у гонар Усіх Святых у Мінску, рэканструяваны Нацыянальны тэатр оперы і балета, Белдзяржцырк, Палац водных відаў спорту ў Брэсце, футбольны стадыён у Гродне і яшчэ дзясяткі ўстаноў.

Новы станок па плазменным раскроі металу.

Галоўны інжынер Аляксандр МІГУРА дэманструе ўзоры прадукцыі.

Пры непасрэдным удзеле ААТ «Белсантэхмантаж-2» былі ўзведзены ці не ўсе значныя сацыяльна-культурныя, спартыўныя, вытворчыя аб'екты краіны — аўтамабільны, трактарны і маторны заводы ў Мінску, Гродзенскае аб'яднанне «Азот», РУП «ВА Беларуськалій», атэлі «Еўропа», «Планета», «Беларусь» і «Юбілейная», Палац Рэспублікі, сталічны метрапалітэн, лядовыя палацы ў Мінску, Брэсце і Гродне, Дом Міласэрнасці, шэраг гіпермаркетаў і гандлёвых цэнтраў, Футбольны манеж, «Мінск-Арэна»... На апошняй з названых будоўляў, дарэчы, працавалі спецыялісты ажно 4 мантажных упраўленняў таварыства, штомесяц асвойваючы сантэхнічных работ на 1 мільярд беларускіх рублёў!

На прадпрыемстве заўсёды праводзіцца работа па паляпшэнні і кантролі якасці прадукцыі. Сёння на выпрабаванні — начальнік лабараторыі Аляксандр РЫБАКОЎ, начальнік канструктарска-тэхналагічнага аддзела Алена КОРЗУН і начальнік аддзела тэхнічнага кантролю Васіль БАРАНЧУК (злева направа).

«У краіне, напэўна, няма іншай арганізацыі, што набліжаліся б да нас па колькасці ці аб'ёме выкананых работ, — адзначаюць у таварыстве. — Хіба толькі калегі з ААТ «Белсантэхмантаж-1», якое абслугоўвае ўсходнюю частку краіны. Нашу арганізацыю добра ведаюць нават на ўрадавым узроўні, бо мы часта працуем на аб'ектах, якія знаходзяцца на кантролі кіраўніцтва дзяржавы». Напрыклад, летась мантажныя ўпраўленні ААТ «Белсантэхмантаж-2» завяршылі комплекс работ па мадэрнізацыі дрэваапрацоўчага камбіната «Івацэвічыдрэў». Наогул жа падчас выканання дзяржаўнай праграмы буйнамаштабнай мадэрнізацыі ўстаноў аховы здароўя спецыялісты ААТ «Белсантэхмантаж-2» удзельнічалі ў рэканструкцыі абсалютна ўсіх сталічных і абласных бальніц, у тым ліку ў рэканструкцыі будынка ДУ «РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі» Мінздрава РБ.

Акрамя таго, усе школы, дзіцячыя садкі ў Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях — традыцыйныя аб'екты працы для нашых спецыялістаў. Бо камерсанты ад будаўніцтва сюды не ідуць. «Мы ж выконвалі і будзем выконваць гэтыя заказы. Летась вось здалі новы дзіцячы садок у Лагойску, сяроднюю школу на 1020 месцаў у сталічным мікрараёне Каменная Горка-2. Увогуле, ніводнае мантажнае ўпраўленне без справы не сядзіць, штогод вядзе ў сярэднім 20 аб'ектаў».

Чалавечы фактар

Якімі б сучаснымі ні былі абсталяванне і камплектуючыя, канчатковы вынік і якасць выкананых работ усё адно шмат у чым залежаць ад людзей, іх вопыту, кваліфікацыі, матываванасці і адказнасці за сваю працу. Пра вельмі важны чалавечы рэсурс нам расказвае **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аляксей МЯЛЕШКА.**

— Сёння ў ААТ «Белсантэхмантаж-2» працуюць высокакваліфікаваныя інжынерна-тэхнічныя работнікі і рабочы персанал агульнай колькасцю каля 2000 чалавек. І калі гэтая лічба цягам апошніх некалькіх гадоў крыху скарацілася, то вытворчасць працы, наадварот, пастаянна расце. Нам, у сваю чаргу, ёсць чым матываваць работнікаў — гэта і стабільны заробак, і шэраг сацыяльных гарантый, прадугледжаных працоўным дагаворам. Абавязкова падтрымліваем і маладых супрацоўнікаў, і ветэранаў працы (за паўвекавую гісторыю самога ААТ звыш 1100 чалавек адпрацавалі ў яго сістэме больш за 25 гадоў!). Стымулюем працоўныя дынастыі (іх у арганізацыі даволі многа), аказваем дадатковую матэрыяльную дапамогу пры ўступленні ў шлюб, пры нараджэнні дзіцяці, пры вяртанні з арміі і г.д.

У Мінску для супрацоўнікаў арганізацыі дзейнічаюць два інтэрнаты — агульны, для часовага пражывання работнікаў, і маласямейны, у цэлым на 580 месцаў.

Актыўна супрацоўнічае акцыянернае таварыства з навучальнымі ўстановамі: са сталічнага ліцэя №23 і БНТУ рэгулярна на практыку прыходзіць моладзь. Той, хто выдатна зарэкамендуе сябе, можа разлічваць на далейшае працаўладкаванне. Таксама на прадпрыемства выйшаў Гродзенскі каледж камунальнай гаспадаркі, чые навучэнцы зацікаўлены ў перспектыве працаваць на ААТ «Белсантэхмантаж-2». «З імі таксама заключаем дамовы на практыку. Спачатку возьмем некалькіх чалавек, але гатовы і да пашырэння супрацоўніцтва», — адзначае суразмоўца.

Усе — лепшыя

«Якое з рэгіянальных мантажных упраўленняў можна асабліва адзначыць і ўхваліць за высокія паказчыкі?» — цікавімся ў **намесніка дырэктара па эканоміцы і знешнеэканамічнай дзейнасці Сяргея ЗАЛЫГІНА.**

— У нас дрэнна ніхто не працуе, усе рэнтабельныя. Сярод моцных філіялаў — Брэсцкае мантажнае ўпраўленне, сталічнае 4-е мантажнае ўпраўленне, Салігорскае. Апошняе з названых — лідар па вытворчасці працы. Яго супрацоўнікі цягам апошніх 10 гадоў актыўна ездзяць не толькі па Мінскай вобласці, але і ўвогуле па краіне, прыходзячы на дапамогу іншым падраздзяленням, дзе гэта патрэбна. Добрую рэпутацыю падтрымліваюць нашы мантажныя ўпраўленні ў абласных цэнтрах, Гродне і Брэсце. У звязцы з асноўнымі генпадрадчыкамі (у Брэсце гэта 8-ы будаўнічы трэст, у Гродне — «Гроднапрамстрой») нашы філіялы добра зарэкамендавалі сябе практычна на ўсіх буйных аб'ектах, што ўзводзіліся ў гэтых гарадах і па абласцях».

Аб паспяховасці працы ўсіх структурных падраздзяленняў яскрава сведчаць і лічбы. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі ў сярэднім па таварыстве — 8%. Гэта дастаткова высокі паказчык (параўнаем з крызісным 2011 годам — 5%). Аб'ём работ, выкананых за год, складае больш як 500 мільярдаў рублёў.

З перспектывай на экспарт

Увесь мінулы год спецыялісты арганізацыі шмат працавалі за межамі краіны. «Калі быць дакладным, цягам 1,5 года 70 нашых спецыялістаў працавалі ў Венесуэле на будаўніцтве 1200 кватэр, пракладвалі інжынерна-тэхнічныя сеткі, — расказвае намеснік дырэктара па эканоміцы. — Таксама нашы супрацоўнікі запатрабаваны ў Расійскай Федэрацыі: у Калінінградзе летась рабілі паліклініку ФСБ, зараз працуюць на ўзвядзенні вучэбных карпусоў той жа ФСБ».

У планах — экспарт будаўнічых паслуг, пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва як з суседзямі па СНД, так і з еўрапейскімі краінамі. Ужо ёсць папярэдняя дамоўленасць наконт удзелу ва ўзвядзенні завода па вытворчасці ўцяпляльных матэрыялаў у Цвяры (РФ), на будаўніцтве аналагу «Беларуськалія» — Гарлыкскага горна-ўзбагачальнага камбіната (Туркменістан). У перспектыве беларусы хочуць выйсці на еўрапейскія краіны — Чэхію, Славакію, Венгрыю. Тым больш, перадумовы для гэтага ёсць: камплектуючыя выкарыстоўваюцца ў асноўным імпартныя, тэхналогіі прымяняюцца самыя сучасныя, еўрапейскія, якасць работ не горшая, чым у Еўропе, а аб'ём — значна большы, чым у тамтэйшых фірмаў. «Праблема толькі ў тым, што нас мала ведаюць на гэтым рынку. Трэба прэзентаваць сябе больш шырока, распрацоўваць адпаведную маркетынгавую праграму».

Палац водных відаў спорту ў Брэсце ўключае ў сябе 4 басейны, 6 спартыўных залаў, абсталяваных у адпаведнасці з сусветнымі стандартамі для правядзення спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню. Будынак палаца пабудаваны па індывідуальным праекце складанай канфігурацыі з агульнай плошчай звыш 26000 кв.м.

Начальнік фарбавальнага цэха Мікалай ЯКУБОВІЧ.

КАНТАКТЫ

ААТ «Белсантэхмантаж-2» г. Мінск, вул. Брылеўская, 15, тэл. 8 (017) 222 79 61, 8 (017) 222 75 16 http://www.bstm-2.by

Філіял завод «СанТэхДэталь» г. Мінск, вул. Чыгуначная, 116, тэл. 8 (017) 270 55 03 http://www.std.by

Філіял завод сантэхзагатовак г. Гродна, вул. Горкага, 117, тэл. 8 (0152) 43 52 77 http://stz.by/

УНП 100286253

МЯСНОЙ ДЗЯРЖАВЫ СМАЧНЫ ПАЧАСТУНАК

Недалёка ад цэнтра сталіцы, на вуліцы Казінца, 46, больш як паўстагоддзя таму прапісаўся Мінскі мясакамбінат — найбуйнейшы вытворца мясаперапрацоўчай галіны нашай краіны. Менавіта тут выпускаюць каўбасы, сасіскі, вяндліну, далікатэсныя прадукты з ялавічыны і свініны, блінчыкі, пельмені пад такімі пазнавальнымі брэндамі, як «Мясная дзяржава», «Кухарэвіч» і «Вундэр». З поўным асартыментам якаснай мясной прадукцыі, здольнай задаволіць густ нават самага патрабавальнага пакупніка, можна пазнаёміцца ў фірмовых крамах мясакамбіната.

Брыгадзір Кірыл МАХНАЧ і аператар Ігар КУНІЦКІ на ўчастку тэрмаапрацоўкі мясапрадуктаў.

Многія мясныя паўфабрыкаты праходзяць праз участак, дзе працуе ветэран вытворчасці Таццяна ШУТ.

— Наша прадукцыя самая якасная і смачная, — кажа ветэрынарны ўрач цэха паўфабрыкатаў Таццяна ШЧАРБАКОВА.

Каўбаса а-ля Італія

Шмат на Мінскім мясакамбінаце і сучаснай прадукцыі з цікавымі харчовымі дабаўкамі. У прыватнасці, новы від варанавэнджанай **каўбасы «Балканская»** мае смак вяндліны, туды дадаюцца, акрамя таго, і буйна здробненыя спецыі. Яе адзначылі залатым медалём на конкурсе «Залатая восень 2012» у Маскве і сярэбраным медалём на конкурсе «Аграрусь 2012» у Санкт-Пецярбургу.

А напрыканцы мінулага года мясакамбінат парадаваў гурманаў арыгінальнай лінейкай сыравэнджаных каўбас па італьянскай тэхналогіі.

— Гэта **каўбаса «Палерма», каўбаскі «Княжацкія»** са смакам сыру, а таксама **каўбаса «Італьянская з папрыкай»,** апошняя прыйдзецца даспадобы аматарам востранькага, — працягвае знаёміць з навінкамі, якія выпускаюцца на Мінскім мясакамбінаце, Таццяна Падаліцкая. — Яны гатуюцца з прымяненнем асаблівых харчовых дабавак і пры выкананні традыцыйных тэрмінаў саспявання. Абавязкова паспытайце гэту каўбасу, і вы адкрыеце для сябе сапраўдны смак італьянскай каўбасы салямі.

Навінка ад «Кухарэвіча»

Мінскі мясакамбінат адзін з першых у Беларусі асвоіў вытворчасць паўфабрыкатаў з ялавічыны мясных парод. Новая элітная прадукцыя мае больш высокую харчовую і дыетычную каштоўнасць, вылучаецца высокай колькасцю амінакіслот і бялку. Пакуль што ў продаж паступаюць толькі буйнакавалкавыя паўфабрыкаты з мармуровага мяса. У планах — выпускаць іх порцыямі і тым самым зрабіць больш даступнымі для пакупнікоў з розным дастаткам.

Паўфабрыкат «Лодачка эліт».

«Кухарэвіч» — лепшы сябар кожнай гаспадыні

Асобай увагі заслугоўваюць мясныя паўфабрыкаты пад гандлёвай маркай «Кухарэвіч». Яны выпускаюцца з ахалоджанай сыравіны ўласнай вытворчасці, у зручнай эстэтычнай упакоўцы. Такія прадукты эканомяць час гаспадыням на кухні, а таксама з'яўляюцца незаменнымі падчас адпачынку.

— У аматараў адпачынку на прыродзе карыстаецца папулярнасцю новая лінейка шашлыкоў з экзатычнымі смакамі: **шашлык «Клубнічна-перачны», «Усходні з маяранам», «Сакавіты» («Сочный»), «Пікантны» і «Алтайскі з брусніцамі»**, які атрымаў залатую ўзнагароду на конкурсе «ГУСТ-2012», — кажа Таццяна Падаліцкая. — Ахвотна набываюць гаспадыні ды студэнты нашы пельмені, якія вырабляюцца з натуральнай ялавічыны, свініны і спецый, без дабаўлення соі і харчовых дабавак. Таксама Мінскі мясакамбінат з'яўляецца адзіным прадпрыемствам, якое вырабляе варэнікі і блінчыкі з рознымі начынкамі і джэмамі.

Спецыялісты прадпрыемства пастаянна працуюць над расшырэннем і абнаўленнем асартыменту паўфабрыкатаў. Так, у другім паўгоддзі мінулага года распрацаваны новыя, арыгінальныя па форме віды **паўфабрыкатаў хуткага прыгатавання: «Лодачка эліт», «Ялавічына дэкор», «Кішэнькі эліт» («Кармашки элит»)**. Апошнія вырабляюцца з ялавічнай выразкі і нагадваюць па форме кішэнькі, запоўненыя здробненым фаршам, цыбуляй і сырам. Для любой гаспадыні такі прадукт стане сапраўдным упрыгожаннем стала.

Разам з тым тэхнолагі камбіната пераканалі, што не збіраюцца спыняцца на дасягнутым, будуць і надалей здзіўляць сваіх пакупнікоў, пачынаючы ад малазабяспечаных да гурманаў, новымі відамі прадукцыі.

— У бліжэйшы час мы плануем выпусціць сыравэнджаныя прадукты са штучнай цвіллю са смакам труфеля і грыбоў, а таксама «Кумпяк Хамон», — распавяла Таццяна Падаліцкая. — Гэтыя новыя віды італьянскіх прадуктаў вызначаюцца больш працяглымі тэрмінамі выспявання.

Смак, знаёмы з савецкіх часоў

На ўнітарным прадпрыемстве «Мінскі мясакамбінат», якое ў 2011 годзе адзначыла свой 55-гадовы юбілей, сёння выпускаецца больш за 500 найменняў мясных прадуктаў. Сярод іх як прынцыпова новыя віды каўбасных вырабаў і паўфабрыкатаў, так і вырабленыя па праверaных часам традыцыйных тэхналогіях і рэцэптурах, што само па сабе ўжо з'яўляецца гарантыяй якасці прадукцыі.

— Мы па-ранейшаму выпускаем любімыя з савецкіх часоў ДАСТаўскія вараныя **каўбасы «Доктарская»** і **«Дыябетычная»,** — распавядае **галоўны тэхнолаг Мінскага мясакамбіната Таццяна ПАДАЛІЦКАЯ.** — Пры іх вырабе не выкарыстоўваюцца комплексныя харчовыя дабаўкі, а толькі мясная сыравіна, натуральныя спецыі, соль і снег, каб надаць прадукцыі сакавітасць. Большасць мясакамбінатаў адмовіліся ад іх вытворчасці, бо гэта эканамічна нявыгадна. Але мы арыентуемся ў першую чаргу на нашага пакупніка, які за «савецкія» каўбасы штодзень галасуе рублём.

А зусім нядаўна на прадпрыемстве выпусцілі каўбасу пад назвай «Як раней», якая дзякуючы дымапранікальнай абалонцы набывае прыемны прысмак вэнджання. Новы прадукт адрозніваецца не толькі вытанчаным смакам, але і арыгінальнай маляўнічай абалонкай з сімволікай СССР. «Глядзіш на яе — і адразу згадваюцца старыя добрыя савецкія часы», — з усмешкай кажа галоўны тэхнолаг прадпрыемства.

Ганарыцца Мінскі мясакамбінат і тым, што захаваў у сваім асартыменце прадукцыю, якая вырабляецца па спрадвечна беларускіх рэцэптах. Гэта каўбасы **«Вясковая»** і **«Хатняя з каньяком»** у натуральнай абалонцы, а таксама натуральныя субпрадуктовыя вырабы: зельцы, сальтысоны, рулеты ручной работы, прадукты ў жэле. А такі папулярны паўфабрыкат, як, напрыклад, **«Рабрынкі Беларускія»**, паводле слоў спецыяліста, гатуецца практычна па бабуліным рэцэпце: замочваецца ў расоле, у які дадаецца толькі соль і спецыі.

Брыгада фармоўшчыкаў працуе на ўчастку вэнджаных вырабаў. Злева направа: Таццяна КАМЕНКА, Валянціна НОВІКАВА, Ірына ФАЛІТАР, Ніна КАСЦЮКЕВІЧ, Ніна КОРЗУН, Ганна САМУСЕВІЧ, Валянціна МІКЕЛЬ, Вольга ДЗЕГЦЯРОВА.

Сучасная ўпакоўка падаўжае тэрмін прыдатнасці

Сёння пакупнік патрабуе не толькі якаснага і карыснага прадукту, але і прыемнай, эстэтычнай упакоўкі.

— Мы імкнёмся да таго, каб наша ўпакоўка была маляўнічая, бо чалавек спачатку набывае вачыма, а пасля толькі каштуе прадукцыю, — кажа Ірына Казленка. — Стараемся ўпакоўваць усё толькі ў маркіраваную абалонку, каб на ёй была відаць назва, гатунак, састаў прадукту, бо на папяровай этыкетцы надпіс можа сцерціся. Ідзём насустрач пакупніку і ў тым, што ўпакоўваем прадукцыю рознай вагой, пачынаючы ад 8 сасісак, якімі сям'я з чатырох чалавек можа павячэраць, і да 5 кілаграмаў.

Дарэчы, менавіта дзякуючы сучаснай італьянскай лініі для ўпакоўкі сасісак, паўвэнджаных каўбас, сардэлек у вакуумнае і газавае мадыфікаванае асяроддзе, якую летась устанавілі на мясакамбінаце, тэрміны захоўвання прадукцыі павялічыліся практычна ў два разы. Гэта дазваляе рэалізоўваць яе ў больш аддаленыя рэгіёны Расійскай Федэрацыі, Казахстан.

Паўфабрыкат рулет «Казка».

«Вундэр» — усё смачнае і карыснае дзецям!

Для аматараў мяса дашкольнага і школьнага ўзросту мясакамбінат выпусціў новую лінейку прадукцыі пад брэндам «Вундэр», якая адрозніваецца яркім дызайнам. Гэтая лінія ўключае ў сябе **вараную каўбасу «Малайчынка» («Молодчинка»), сасіскі «Смекалики», «Знайкі-зазнайкі», сардэлькі «Нязнайка».** Гэта прадукцыя выпускаецца з паніжанай колькасцю солі, тлушчаў, спецый, павышанай колькасцю бялку. Палюбіліся дзецям таксама пельмені «Сонейкі» («Солнышки») з натуральным апельсінавым валакном, «Смачняшкі» («Вкусняшки»), узбагачаныя лактулозай, ёдам і селенам, якія садзейнічаюць прафілактыцы страўнікава-кішачных захворванняў.

— Па просьбе маці дзетак, якім забаронена ўжываць прадукты з крухмалам, мы асвоілі выраб безглютэнавых сардэлек «Усмешка» («Улыбка»), — распавядае **начальнік каўбаснага цэха Ірына КАЗЛЕНКА.** — Гэты прадукт узбагачаны лактулозай, вельмі карысны для арганізма.

Бактэрыёлаг першай катэгорыі Людміла МАЛАФЕЕВА — з тых спецыялістаў, хто забяспечвае пастаянны контроль за якасцю прадукцыі.

Кансервы па-стаўбцоўску

Летась на філіяле УП «Мінскі мясакамбінат» «Стоўбцы» адкрыўся новы цэх па вытворчасці мясных кансерваў і паштэтаў, што выпускаюцца пад гандлёвай маркай «Мясная дзяржава». Разам з прадукцыяй, якая вырабляецца па тэхнічных умовах, выпускаюцца і кансервы, зробленыя ў адпаведнасці з ДАСТам: **«Ялавічына тушаная» і «Свініна тушаная»**, дзе закладка мяса па рэцэптуры складае 97,5%. Ужо з'явіліся ў продажы і знайшлі свайго пакупніка фірмовыя прадукты ад філіяла «Стоўбцы» — гэта **кансервы «Флякі па-стаўбцоўску» і «Флякі па-стаўбцоўску ў таматным соусе»**. Тэрміны прыдатнасці мясных паштэтаў павялічыліся да аднаго года, а мясных кансерваў — да 5 гадоў.

Тут працуе аўтаматычная гарызантальная ўпаковачная машына, якая запячатвае каўбасныя вырабы ў герметычныя пакеты з інертным газам.

Спалучэнне кошту і якасці прыемна здзівіць пакупніка

«За якасць адказвае кожны» — менавіта такі лозунг бачаць работнікі Мінскага мясакамбіната, калі прыходзяць на працу. І, як пераканаліся нас у вытворчай лабараторыі прадпрыемства, гэта не пустыя словы.

— Кантроль за якасцю прадукцыі на нашым прадпрыемстве знаходзіцца ў цэнтры ўвагі, — кажа **начальнік вытворчай лабараторыі Людміла ТРУБЕЦКАЯ.** — І сыравіна, і гатовыя вырабы штодзённа праходзяць усебаковы лабараторны кантроль. Для гэтага ў нас у лабараторыі маецца тры аддзелы: фізіка-хімічны, мікрабіялагічны і аддзел радыяцыйнага кантролю. Яны забяспечаны ўсім неабходным сучасным абсталяваннем. У прыватнасці, закуплена вельмі дарагое абсталяванне для правядзення даследаванняў па выяўленні антыбіётыкаў у мясе.

Акрамя таго, і сыравіна, і гатовая прадукцыя праходзяць кантроль у незалежна акрэдытаваных лабараторыях. У прыватнасці, у Мінскага мясакамбіната заключаны дагаворы з Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам НАН Беларусі, дзе праводзяцца даследаванні прадукцыі на паказчыкі бяспекі.

— Мае знаёмыя часам пытаюцца, якую каўбасу лепш набыць, — працягвае Людміла Трубецкая. — Сама набываю і ўсім рэкамендую смела набываць нашу прадукцыю, бо яна праходзіць вельмі строгі кантроль. **Да таго ж бяспека і якасць прадукцыі Мінскага мясакамбіната пацверджана сертыфікатамі адпаведнасці СТБ ISO 9001, HACCP і СТБ 18001.**

Маецца на прадпрыемстве і аддзел вытворча-ветэрынарнага кантролю, які ажыццяўляе ў тым ліку і ўваходны кантроль сыравіны і дапаможных матэрыялаў, што паступаюць на тэрыторыю камбіната.

— Наша задача — выпусціць бяспечную прадукцыю для пакупніка, — адзначыў **галоўны ўрач Сяргей САНЮК.** — Таму, калі падчас папярэдняга агляду жывёлы з'яўляецца хоць нейкае маленькае сумненне ў стане яе здароўя, яе не дапускаюць на вытворчасць, а пакідаюць для лабараторных даследаванняў. Поўны кантроль (да таго, як паступіць на прадпрыемства) праходзяць у тым ліку і дапаможныя матэрыялы: шпагат, плёнка, харчовыя дабаўкі, спецыі.

Запрашаем у нашы фірмовыя крамы

На прадпрыемстве шырока развіта фірмовая гандлёвая сетка, якая складаецца з 14 крам і 8 гандлёвых аб'ектаў на рынках. Усе яны размешчаны ў розных частках горада Мінска, а таксама Мінскай і Магілёўскай абласцях. У бліжэйшы час плануецца адкрыццё 15-ай крамы на вуліцы Нёманскай, 22 у Мінску (у 10 хвілінах хады ад станцыі метро «Каменная Горка»).

— Прыязджайце да нас па смачную і якасную прадукцыю, — карыстаючыся магчымасцю, запрасіла чытачоў «Звязды» **загадчыца новай крамы Таццяна НЯХАЕВА.** — У нас ва ўсіх фірмовых крамах вельмі багаты асартымент як паўфабрыкатаў, так і каўбасных вырабаў. А на Нёманскай будзе яшчэ і свой цэх па рассяканні мяса, таму пэўныя віды прадукцыі будуць каштаваць нават танней, чым у іншых крамах. Новая крама яшчэ не адчынілася, а мы ўжо рыхтуем сюрпрызы для сваіх будучых пакупнікоў. Гэта самыя розныя акцыі, зніжкі на пэўныя групы тавараў. Людзям варта заходзіць да нас яшчэ і таму, што, акрамя мясных вырабаў, там будуць прадстаўлены і малочныя прадукты, хлебныя і кандытарскія вырабы і г.д.

Прываблівающь фірмовыя крамы Мінскага мясакамбіната пакупнікоў не толькі свежай прадукцыяй у больш шырокім асартыменце, але і мінімальнымі нацэнкамі. Так, калі гандлёвая нацэнка на вэнджаныя вырабы ў іншых крамах можа складаць ад 30% і вышэй, то тут яна складае 15-18%.

Практыкуецца на прадпрыемстве і выязны фірмовы гандаль. Прычэпы з пазнавальнай фірмовай прадукцыяй можна ўбачыць у Сеніцы, Бараўлянах, на тэрыторыі буйных мінскіх заводаў.

Варта адзначыць, што прадукцыю Мінскага мясакамбіната любяць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.

— Асноўны наш рынак збыту — Расійская Федэрацыя, — распавядае **начальнік аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Аксана ЛАПО.** — Рэалізуем туды каўбасныя вырабы, паўфабрыкаты, мясную сыравіну — ялавічыну, свініну. Пакуль асвоена ў асноўным Масква, Маскоўская вобласць і Санкт-Пецярбург. Плануем працягваць цеснае супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй і далей пашыраць геаграфію продажаў нашага мясакамбіната. У межах Мытнага саюза пачынаем асвойваць рынак Казахстана.

Праца на гэтым участку патрабуе асаблівай чысціні, таму ў камплект спецадзення ўваходзяць нават ахоўныя маскі. Брыгадзір Настасся СІПАТАЯ (у цэнтры), фармоўшчыцы Тэрэза ВОСІПЧЫК і Жанна ЛЮЦКО вырабляюць сардэлькі «Доктарскія традыцыйныя».

За ўзнагародамі — праца ўсяго калектыву

Пра заслугі калектыву Мінскага мясакамбіната сведчаць і шматлікія ўзнагароды, атрыманыя на розных міжнародных конкурсах і выставах. Толькі за 2012 год скарбонка прадпрыемства папоўнілася на 12 залатых і 3 сярэбраныя медалі. Мясная прадукцыя адзначана і шматлікімі дыпломамі, у тым ліку дыпломам «Залаты Густ» за стабільную якасць, укараненне новых тэхналогій і шырокі асартымент прадукцыі, што выпускаецца. За кожнай з узнагарод стаіць карпатлівая праца ўсяго калектыву. Малады і ініцыятыўны **генеральны дырэктар УП «Мінскі мясакамбінат» Уладзімір ЛАЗОЎСКІ** гэта цудоўна разумее і клапоціцца пра паляпшэнне ўмоў працы і жыцця работнікаў.

Так, на балансе прадпрыемства знаходзяцца тры інтэрнаты, у якіх пражывае больш за 30% працаўнікоў прадпрыемства. Калектыўным дагаворам прадугледжана выдзяленне не менш чым праз 3 месяцы пасля пачатку работы на мясакамбінаце ложка-месца маладым работнікам, якія адзінока пражываюць і маюць патрэбу ў жыллі, а таксама асобных пакояў у маласямейным інтэрнаце сямейным работнікам пры стажы работы не менш за 2 гады, за выключэннем маладых спецыялістаў, якія прыбылі па накіраванні. Гэта спрыяе прыцягненню неабходных рабочых і спецыялістаў з іншых рэгіёнаў рэспублікі.

Вельмі сур'ёзна дырэктар ставіцца і да якаснага абслугоўвання работнікаў у заводскай сталовай, дзе гарачае харчаванне арганізавана ў дзве змены. Абеды, згодна з калектыўным дагаворам, ільгатуюцца за кошт прыбытку прадпрыемства, таму паўнавартасна паабедаць тут можна ў сярэднім усяго за 10 тысяч рублёў. Акрамя таго, усе работнікі могуць набываць прадукцыю ў кошт будучай зарплаты ў фірмовай краме, што побач з заводам.

Для аматараў здаровага ладу жыцця адчынены дзверы спартыўнай і трэнажорных залаў, уласнага водна-аздараўленчага комплексу з басейнам і парылкамі. Маецца на прадпрыемстве і міні-паліклініка, дзе працуе ўрач-тэрапеўт, тры фельчары, медсястра.

— Забяспечваем усіх жадаючых работнікаў пуцёўкамі ў беларускія санаторыі, — распавядае **старшыня прафкама Алена АФАНАСЕНКА,** якая працуе на мясакамбінаце 32 гады, з іх 25 на вытворчасці. — Акрамя таго, дапамагаем бацькам прыстроіць дзетак на лета: кожны работнік можа аздаравіць свайго сына ці дачку ў школьным і аздараўленчых летніках, санаторыі. Што тычыцца пуцёвак у аздараўленчыя летнікі, то адзінокім і шматдзетным мамам, якіх у нас шмат на прадпрыемстве, выдаём пуцёўкі бясплатна. Астатнія работнікі плацяць 10% ад кошту пуцёўкі. Вельмі шмат бяруць пуцёвак у мінскую водагразелячэбніцу, дзе работнікі, пасля таго як адпрацавалі ў першую змену, могуць прайсці поўны курс лячэння. Ладзім шмат паездак па гістарычных месцах Беларусі, набываем білеты ў кінатэатры, цырк, на канцэрты.

— Адным словам, не даём нашым работнікам сумаваць, — дадае **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі і сацыяльна-бытавых пытаннях Таццяна ШЫНКЕВІЧ,** — Мастацкая самадзейнасць у нас пастаўлена так, што як мінімум раз на месяц праводзім цікавае мерапрыемства. У лютым, напрыклад, пройдзе два мерапрыемствы: конкурс маладых пар, прысвечаны Дню закаханых (галоўны прыз — рамантычная вячэра пры свечках у малой зале заводскай сталовай) і рыцарскі турнір, прысвечаны Дню Абаронцаў Айчыны. Часта ладзім унутрызаводскія спартыўныя спаборніцтвы, а таксама ахвотна ўдзельнічаем у гарадскіх і абласных. Так, у пачатку лютага актыўна прымалі ўдзел у зімовым спартыўным святе «Мінская абласная лыжня 2013».

Складальнік фаршу Тамара КАЗЛОВА працуе на сучасным высокапрадукцыйным абсталяванні.

УНП 100003394

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Валерый ЮР'ЕЎ, Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Надзея ДРЫЛА, Аляксандр ФУРСАЎ, Вольга ГЕЦЭВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА, Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва прадпрыемстваў.

Зямля святога Валянціна

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Між іншым, адзіная ў нашым краі парафія апекуна закаханых і хворых на эпілепсію з'явілася яшчэ ў 1996 годзе дзякуючы задумцы ксяндза Уладзіслава Завальнюка, пробашча мінскай парафіі святых Сымона і Алены.

— Я быў незадаволены тым, што моладзь падчас вяселля едзе кудысьці на курган ці да нейкага дрэва, — узгадвае айцец Уладзіслаў. — Таму я ўвесь час хадзіў з ідэяй, каб моладзь магла прыехаць у Смалявічы, дзе рэгістравалі парафію, бо гэта недалёка — 30 кіламетраў, абвянчацца ці папрасіць у святога Валянціна Божай ласкі, блаславення на ўсё жыццё.

Валянцін можа шмат выпрасіць, як заступнік на небе, каб каханне маладых стала трывалым і настолькі моцным, што праз 50 гадоў яны будуць святкаваць залатое вяселле.

Спачатку людзі маліліся на кватэрах, пасля — у будаўнічым вагончыку, і толькі потым у смалявіцкіх католікаў з'явілася невялічкая, сціплая ўнутры, але ўтульная святыня. На шэрагах лаў ляжаць малітоўнікі, нехта пакінуў футарал ад акуляраў. Айцец Андрэй Квяцінскі, пробашч парафіі святога Валянціна, кажа, што ў нядзелю на набажэнстве прысутнічаюць каля сотні вернікаў, а летам кампанію мясцовым парафіянам складаюць дачнікі, якія кватаруюць літаральна ва ўсіх ваколіцах райцэнтра.

У маладога прыхода малады святар — Андрэй Квяцінскі, чалавек у карычневай расе са спакойным, але ўпэўненым голасам. Святаром стаў амаль 4 гады таму. Вучыўся ў каледжы на майстра лясной гаспадаркі, але вера ў Бога перамагла — забраў дакументы і пайшоў у ордэн капуцынаў.

— Да святарства я прыйшоў крыху банальным спосабам. Напачатку было захапленне роднай мовай, культурай, — узгадвае айцец Андрэй. — Я захапляўся дзейнасцю ксяндза Уладзіслава Чарняўскага з вёскі Вішнева, які, хоць і працаваў у заходняй частцы Беларусі, дзе большасць каталіцкага духавенства служыла літургію па-польску, але актыўна імкнуўся ўжываць беларускую мову. Ужо потым, калі пайшоў вучыцца, пачаў глыбей пазнаваць хрысціянскую веру, яе сутнасць. Цяпер інакш стаўлюся да свайго паклікання.

Упершыню аб прыходзе святога Валянціна Квяцінскі пачуў на пачатку «нулявых». Узгадвае, што касцёл толькі збіраліся будаваць, а людзей на Каляды ў вагончыку было, як селядцоў у бочцы. Аднак тады ён яшчэ не мог паверыць, што гэтае месца стане яго парафіяй.

— Кажу шчыра, спачатку я спалохаўся, — прызнаецца святар, які ўжо з паўгода працуе пробашчам у Смалявічах. — Новага святара адразу ўспрымалі насцярожана, не давяралі. Цяпер, калі пазнаёміўся з людзьмі, страх знік. Вернікі прымаюць цяплей.

— Цікава, а як да чалавека ў манаскай вопратцы ставяцца на вуліцы?

— Часта становіцца страшна за чалавека, які ідзе па вуліцы і так глядзіць на цябе, што можа ўрэзацца ў слуп, — усміхаецца айцец Андрэй. — Бывае, што і з праваслаўнымі блытаюць, аднак гэта не страшна. Па вялікім рахунку, усе ставяцца добра.

Разам з айцом у невялічкай кватэрцы, што ля мясцовай плошчы з традыцыйным помнікам Леніну, жыве яшчэ адзін брат-законнік — Андрэй Шастакоў. Дзень у іх пачынаецца прыкладна а 6 гадзіне раніцы. Спачатку малітва, хуткі сняданак, пасля — набажэнства ў касцёле, хатняя і парафіяльная праца, сустрэчы з вернікамі, увечары зноў малітва, а калі ёсць магчымасць, браты-капуцыны любяць і ў кіно схадзіць.

— На жаль, да нас прыходзіць не так шмат маладых, вянчаў я ўсяго некалькі пар, — з жалем кажа святар. — Здаецца, што большасць нашых вернікаў — гэта тыя, каму каля 50.

— Але ў парафіі з падобнай назвай павінны быць усе перадумовы для працы з моладдзю.

— Назва моцна абавязвае і мяне, і вернікаў. Думаю, трэба нешта зрабіць для працы з сем'ямі, моладдзю. У сучасным свеце паняцце «каханне» настолькі перакручана ў галовах і сэрцах людзей, што яны называюць ім іншыя рэчы. І больш за тое, каханне, якое мусіць прыносіць шчасце, задавальненне, прыносіць шмат расчаравання. Праўда, калі прыняць каханне, пабудаванае на любові Божай, яно будзе здаровым. А калі прымаць каханне як эгаізм і геданізм, раней ці пазней гэта прывядзе да трагедыі.

Айцец Андрэй працуе ў Смалявічах паўгода.

У сучасным свеце паняцце «кахання» настолькі перакручана ў галовах і сэрцах людзей, што яны называюць ім іншыя рэчы.

— Цікава, а вы падчас набажэнстваў часта гаворыце пра каханне?

— Так, аднак не заўсёды ў кантэксце святога Валянціна. Ён знакавая фігура, якая накіроўвае ў тэму кахання. Але справай любові пранізана ўсё навучанне Хрыста. Гэта тэма непазбежная.

Праз паўзу айцец Андрэй дадае:

— Нас, каталіцкіх святароў, часта папракаюць за тое, што мы гаворым пра каханне, але самі не сустракаемся з жанчынамі. Мы шмат бачым знутры тое, што нішчыць сучасную сям'ю. У моладзі ўтылітарны падыход да кахання. Нібы яно павінна быць месцам, дзе чалавек здзяйсняе сябе і толькі сябе.

Добрай традыцыі прыязджаць 14 лютага ў госці да святога Валянціна ў мінчан пакуль няма. Збольшага прыязджаюць мясцовыя маладыя, фатаграфуюцца, аднак, як кажа Андрэй Квяцінскі, у касцёл не заходзяць.

— Безумоўна, з турыстамі трэба працаваць, але калі яны прыедуць, што я буду з імі рабіць? — пытаецца святар. — Для гэтага яшчэ трэба стварыць базу, каб прымаць гасцей. Прыход святога Валянціна пакуль не такі вядомы.

— Але ўсё роўна моладзь у Смалявічах будзе святкаваць гэты дзень, абменьвацца валянцінкамі. Як гэта рабіць правільна?

— Што тычыцца валянцінак, дзякуючы легендзе вядома, што Валянцін, калі знаходзіўся за кратамі, напісаў ліст да сляпой дачкі стражніка і вылечыў яе. Гэты ліст, які гаворыць пра любоў, сведчыць, што любоў, якую прэзентуе святы Валянцін, зусім не такая, якую прымаюць у сучасным свеце. Бо хто зробіць добрае ворагу? Нонсэнс. Святы сапраўды паказвае сваім учынкам хрысціянскую любоў. Адзін з галоўных пунктаў вучэння Хрыста — любоў да ворага.

А што да святкавання, мне хацелася б нейтралізаваць падыход да святога як да гандлёвага брэнда. Гэтым ён падобны да святога Мікалая, з якога зрабілі Санта-Клауса, дзядулю ў чырвоным камбінезоне. А найперш гэта былі людзі, якія чынілі любоў. Валянцін можа шмат выпрасіць, як заступнік на небе, каб каханне маладых стала трывалым і настолькі моцным, што праз 50 гадоў яны будуць святкаваць залатое вяселле.

З а. Андрэем, шчырым рупліўцам пра чысціню кахання, мы развітваемся каля бронзавай фігуры святога Валянціна. Святар глядзіць на бронзавага святога, які нібы загінуў за тое, што таямніча вянчаў маладых у язычніцкім Рыме, і дзеліцца думкай, што пры жыцці ён быў больш магутным, з барадой. Я разважаю крыху пра іншае. Было б насамрэч добра, калі б моладзь у гэты дзень шчыра прызнавалася ў каханні адно аднаму, прыходзіла б у Смалявічах да фігуры святога, але сапраўды не забывалася пра значнасць пачуццяў. Магчыма, гэты іх першы візіт калісьці стане падмуркам моцнай сям'і. Няхай жа святы блаславіць іх на гэта!

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота Надзеі БУЖАН.
г. Смалявічы.

Адзіная ў нашым краі парафія апекуна закаханых і хворых на эпілепсію з'явілася яшчэ ў 1996 годзе.

Даты Падзеі Людзі

1913 год — нарадзіўся (вёска Радзеева, цяпер Буда-Кашалёўскі раён) Віталь Цвірка, жывапісец, педагог, народны мастак Беларусі (1963). Выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы і Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Значнае месца ў творчасці займаў пейзаж. Сярод твораў: карціны «Сакавік. Халодны дзень», «Цішыня», «Беларускі пейзаж», «Поўдзень», трыпціх «На зямлі беларускай». Аўтар серый мемарыяльных гарадскіх пейзажаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, індустрыяльных пейзажаў і нацюрмортаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1967). Памёр у 1993 годзе.

1779 год — скончыў свой жыццёвы шлях брытанскі першаадкрывальнік і навігатар Джэймс Кук. Ён быў сынам вясковага парабка. З 7 гадоў стаў працаваць разам з бацькам і толькі ў 13 пайшоў у школу, навучыўся чытаць і пісаць. Мора Джэймс ўпершыню ўбачыў у 17 гадоў, а ў 22 стаў юнгай і паступова даслужыўся да капітана і адмірала. Ён увесь час займаўся самаадукацыяй: «Імкнуцца і дасягаць» — такім быў яго дэвіз. Кук кіраваў трыма экспедыцыямі і тройчы абагнуў Зямлю. Ён адкрыў у Ціхім акіяне 11 архіпелагаў і 27 астравоў, а таксама вызначыў дакладнае геаграфічнае размяшчэнне многіх іншых, адкрытых да яго, астравоў. Дзякуючы распрацаванай ім дыеце ніхто з яго каманды не хварэў на цынгу. Марай Кука было знайсці Паўднёвы мацярык. Справа ў тым, што капітан, як і многія іншыя мараплаўцы XVIII стагоддзя, верыў, што ў паўднёвых водах планеты павінен размяшчацца велізарны мацярык. Павінен — таму што інакш Зямля нібыта перавярнулася б пад цяжарам паўночных земляў. Гэты мацярык Кук так і не знайшоў, Антарктыду пазней адкрылі рускія маракі. Падчас апошняга плавання Кук збіраўся знайсці марскі праход паміж Расіяй і Амерыкай. За гэтае адкрыццё брытанскі парламент абяцаў узнагародзіць каманду дваццаццю тысячамі фунтаў стэрлінгаў — па тых часах вялікія грошы. У раёне Аляскі шлях экспедыцыі перагарадзілі льды, і караблі пайшлі на поўдзень. Там брытанцы адкрылі Гавайскія астравы, дзе і завяршылася жыццё капітана. Праўда, насуперак вядомай песні, Кука не з'елі. Гавайцы, якія ў сутычцы забілі капітана, сапраўды правялі пэўную цырымонію з яго целам у адпаведнасці са сваімі рэлігійнымі звычаямі і лічылі, што тым самым аддалі даніну павагі сваім загінулым. Потым тубыльцы ўсё ж такі перадалі астанкі Джэймса Кука камандзе, і яго пахавалі паводле марскога звычаю — у моры.

1938 год — нарадзіўся (горад Мінск) Аркадзь Іосіфавіч Свірноўскі, беларускі вучоны ў галіне гематалогіі, радыебіялогіі, доктар медыцынскіх навук (1979), прафесар (1990). Аўтар навуковых прац па біялогіі лейкознай клеткі, мадыфікацыі яе ўласцівасцяў і іншых.

Было сказана

Якуб КОЛАС (1882-1956), народны паэт Беларусі: ***«Крыкі спрэчку не развяжуць».***

«Цалаваў Алёну Янка над вадой»



Па гарызанталі: 1. Адказ ад чаго-небудзь на карысць каханага чалавека. **4.** Прыйдзе тая нядзеля, што будзе і маё ...(прык.). **9.** «... ў цябе ўлюблена,\\Яшчэ не зашлюблена». З беларускай народнай песні «Дубочак зялёненькі». **10.** ... да Евы заляцаўся, а ўсе вінаватыя (прык.). **12.** З добрага цеста добрая паляніца, з добрай дзеўкі добрая ...(прык.). **13.** Тое, што і водбліск. **15.** Якая песня — такія ...; якая дзеўка — такія жаніхі (прык.). **17.** Дзявочы век як макаў ... (прык.). **18.** «Дзед бабу палюбіў,\\Бо ... хароша». З беларускай народнай песні «У месяцы верасні». **21.** І певень умее ... паказаць, не толькі зяцёк (прык.). **22.** Малады розум — палявы ...; бяжыць і гудзіць (прык.). **27.** «Жыла ў той хаціне дачка лесніка,\\Жыла ... Галіна». З верша Максіма Танка «Ля вогнішч начлежных». **29.** «Цалаваў Алёну ... над вадой». З песні «Ручнікі» (сл. В. Вярбы, муз. М. Пятрэнкі). **30.** ... дзеду без бабы: ядуць яго вошы і скабы (прык.). **31.** І ў ... не кожнага пускаюць (прык.). **32.** Лепей свой посны ..., чым чужое сала (прык.).

Па вертыкалі: 2. Дзе зяць паганы, там цешчу запрагаюць у ... (прык.). **3.** Любоў не ..., а загарыцца — не патушыш (прык.). **5.** «Пэўна, марыць аб каханні\\... палкае, дзявоча». З верша Якуба Коласа «Таніна тайна». **6.** Апякунка шлюбаў, багіня вяснова-летняй урадлівасці. **7.** І ... гукае, як пары шукае (прык.). **8.** «Пакуль ... чыста стала,\\Я з Раманам пастаяла». З беларускай народнай песні «Ой, ляцелі гусі». **11.** ... не тое, што дзяўчына: чым болей спее, тым смачней будзе (прык.). **14.** «Устань, устань, маё ты ...!\\Залатаструнна йграе ўжо вясна». З паэмы Янкі Купалы «Яна і я». **16.** «Каб хоць на міг уваскрэсла ...,\\Глянь іншы раз на яе». З раманса Максіма Багдановіча «Зорка Венера». **19.** Пра жанчыну незвычайнай прыгажосці і грацыі. **20.** ... п'яніцу любіць, а дачку замуж не аддасць (прык.). **23.** ... прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца (прык.). **24.** «Ціха, мой любы,\\... заснула,\\Ціхенька выйду,\\Каб не пачула». З беларускай народнай песні «Дробны дожджык». **25.** Добрая ... даражэйшая за срэбра і злота (прык.). **26.** Юнак, герой старажытнагрэчаскай міфалогіі, які марыў даляцець да Сонца. **28.** На чужой старане і жук ... , і старая баба — маладзіца (прык.).

Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Уступка. 4. Вяселле. 9. Адна. 10. Адам. 12. Маладзіца. 13. Бляск. 15. Скокі. 17. Цвет. 18. Баба. 21. Гонар. 22. Вецер. 27. Прыгажуня. 29. Янка. 30. Бяда. 31. Прымакі. 32. Праснак.

Па вертыкалі: 2. Сані. 3. Пажар. 5. Сэрца. 6. Лада. 7. Галубок. 8. Вада. 11. Маліна. 14. Сонейка. 16. Каханне. 19. Багіня. 20. Карчмар. 23. Краса. 24. Маці. 25. Цнота. 26. Ікар. 28. Мяса.

■ Выставы

Іерусалім вачыма беларускага фотамастака

У віцебскім Арт-цэнтры Марка Шагала прадстаўлена выстава фотаздымкаў магілёўскага майстра Аляксандра Ліціна «Мой Іерусалім», якая працягвае серыю аўтарскіх выстаў, што былі арганізаваны ў мінулыя гады ў Мінску і Магілёве.

У Віцебску прадстаўлена 35 фотаздымкаў, у якіх адчуваецца аўтарскі почырк Аляксандра. На фотаздымках адлюстраваны не толькі фрагменты гарадскога жыцця, але і вядомыя і не вельмі віды старажытнага горада. На здымках не толькі перададзена прыгажосць горада трох рэлігій. Майстар імкнецца ўбачыць яго непаўторную філасофію. Можа быць, таму на многіх здымках можна ўбачыць зусім розных людзей, жыццёвыя дарогі якіх перасекліся ў Іерусаліме. На партрэтах — яўрэі, мусульмане і хрысціяне, рамеснікі і гандляры, рэлігійныя і свецкія, маладыя і старыя.

Фатограф не баіцца выкарыстоўваць размыты пярэдні план (за што часта сварыцца на сваіх вучняў), акцэнтуючы ўвагу на тым, што знаходзіцца за ім ... І ў гэтым таксама яго філасофія: самае кідкае — не заўсёды самае галоўнае.

Што цікава, часам у цэнтры ўвагі фатографа рэкламныя шыльды. Яны не толькі частка гарадскога асяроддзя, гэта новая, своеасабліва напісаная гісторыя горада на фоне старых дамоў.

Выстава будзе працаваць да 3 сакавіка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Дарагога сына Уладзіміра Адамавіча Лугаўскога, а таксама пляменніцу Марыю і братоў Яўгена і Аляксандра шчыра віншую з днём народзінаў! Моцнага здароўя вам, мае дарагія, дабра і дабрабыту, поспехаў ва ўсіх вашых справах!

Тамара Лугаўская.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 10 лютага.
Месяц у сузор'і Авена.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.31	18.17	9.46
Віцебск	8.24	18.03	9.39
Магілёў	8.21	18.07	9.46
Гомель	8.14	18.07	9.53
Гродна	8.46	18.33	9.47
Брэст	8.42	18.37	9.55

Імяніны

Пр. Мікалая, Пятра, Трыфана.
К. Ліліяны, Валянціна, Кірылы, Мяфодзія.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Муж прыходзіць дадому і бачыць за фіранкай ногі мужчыны. Жонцы:

— Гэта што?!

— Ты думаеш, адкуль у нас новая машына?!

— Я яшчэ раз пытаюся — гэта што?

— Ты думаеш, адкуль у нас новая кватэра і твая новая праца?

— Я пытаюся, чаму карміцель басанож стаіць?!

Учора шэф паслаў нас збіваць ледзяшы. Адзін лядзяш упаў на яго машыну. Хоць ён прадбачліва і прыпаркаваў яе ў 70 метрах ад будынка.

У бальніцы.

— Ён ужо пяты раз за месяц трапляе ў таксікалагічнае аддзяленне.

— У яго жонка вучыцца гатаваць.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 25.227. Індэкс 63850. Зак. № 770.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 лютага 2013 года.